ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
Менск, Пляц Волі № 17, 1-шы паверх
ТЭЛ. Сэкратара—№ 478 Рэдактара—№ 769 Канторы —№ 244 Сэктара прамысловасьці —№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 58 (3147) ЧАЦЬВЕР 12 САКАВІКА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
падпісная плата:
На 1 месяц . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 0 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

ПРЫСУД МІЛЬЕНАУ

Прыгавор вынесен. Спэцыяльнае прысутнічаньне Вярхоўнага суду СССР выканала волю мільёнаў працоўных Савецкага саюзу і ўсяго сьвету, прыняло неабходную меру сацыяльнай абароны да членаў контр-рэвалюцыйнай арганізацыі сацыял-шкодніка ў—меншавікоў—агентаў сусьветнага імпэрыялізму, якія імкнуліся ў крыві мільёнаў працоўных затапіць першую ў сьвеце рэспубліку Саветаў, зьвярнуць фабрыкі капіталістам, зямлю—абшарнікам, устанавіць фашысцкую дыктатуру.

Дзевяць дзён працэсу «Саюзнага бюро» меншавікоў на вачох працоўных усяго сьвету раскрылі гісторыю агіднага прадажніцтва інтарэсаў рабочае клясы, лёкаямі міжнароднага капіталу—партыяй меншавікоў і II сацыял-фашысцкага інтэрнацыяналу.

Гэтыя гістарычныя дзевяць дзён з усёй дакладнасьцю, падрабязнасьцю выкрылі крывавую змову імпэрыялізму—фашызму—меншавізму на краіну Саветаў, на жыцьцё мільёнаў, на будучае працоўных усяго сьвету. Аб гэтым днёх павінен ведаць кожны пратэтары, кожны працоўны!

Сусьветна-гістарычнае значэньне гэтага, працэсу заключаецца яшчэ ў тым, што ён выкрыў прадажніцкую сутнасьць II жоўтага інтэрнацыяналу і сусьветнага меншавізму, якія пад сацыялістычнай шыльдай адурманівалі масы працоўных, затушоўвалі клясавыя супярэчнасьці, падрыхтоўвалі грамадзкую думку сярод рабочых капіталістычных краін для інтэрвэнцыі супроць СССР і займаліся, як і іншыя фашысцкія партыі, непасрэднай падрыхтоўкай узброенага нападу на СССР.

На лаве падсудных сядзелі ўсяго 14 асоб, але ўвесь сьвет убачыў хто за іх сьпіной, хто кіруе іх контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай шпіёнскай работай.

Працэс ліпні раз пацьвердзіў тую яшчэ да гэтага часу вядомую ісьціну, што партыя меншавікоў, якую яе дробна-буржуазная сутнасьць штурхала ў апартуністычнае балота ў хаўрус з буржуазіяй, перашла на непасрэдную службу імпэрыялізму.

Судовае сьледзтва дакладна ўстанавіла, што па дырэктывах лідэраў II інтэрнацыяналу і меншавікоў—Кауцкіх, Гільфэрдзінгаў, Абрамовічаў і кампаніі, контр-рэвалюцыйная група меншавікоў—«Саюзнае бюро» стала на шлях інтэрвэнцыі ў барацьбе з пралетарскай дыктатурай, прыняла за асноўны мэтад сваёй работы шкодніцтва, ўступіла ў блёк з адкрытымі буржуазна-фашысцкімі арганізацыямі—«Прампартыяй» і кулацка-эсэраўскай групай Кандрацьева - Чаянава.

У агульным ланцугу аб'яднаньня чорных сіл рэакцыі меншавікі пад агульным кіраўніцтвам і на грошы надхніцелей інтэрвэнцыі «Гандльпрому» і францускага генштабу атрымалі на сваю долю адказную галіну дзейнасьці па падрыхтоўцы ўзброенага нападу на СССР—шкодніцтва ў нашай гасподарцы і каапэрацыйным апараце забесьпячэньня. Шкодніцтва, дэзарганізатарскія і дывэрсыйныя акты, поруч з прамым шпіянажам, былі асноўнымі мэтадамі барацьбы блёку трох контррэвалюцыйных інтэрвэнцыяністкіх арганізацый («Прампартыя», ТКП, «Саюзнае бюро» меншавікоў) супроць пралетарскай дыктатуры. У гэтай работе меншавіцкая контр-рэвалюцыйная група старалася не адставаць і не адставала ад сваіх саюзнікаў.

Шкоднікі - інтэрвэнцыяністы ўсіх масьцей і колераў сваёй крывавай дзейнасьцю нанесьлі ня мала страт нашаму гаспадарчаму будаўніцтву, але ім не ўдалося, і нікому ня ўдасца зьвярнуць рабочую клясу з генэральнай лініі Ленінскай партыі, з генэральнай лініі сацыялістычнага будаўніцтва.

Ня гледзячы на шалёную падрыўную дзейнасьць шкоднікаў рабочая кляса і калгасьнікі Савецкага саюзу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў саюзе са шматмільённымі бядняцка-серадняцкімі масамі вёскі пераможна ідуць па шляху выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Банкроцтва шкодніцкіх ідэй, банкроцтва зыходзячых з арэны клясавай барацьбы—дробна-буржуазных клясаў у нашай краіне прымусіла іх ідэолёгаў сацыял-шкоднікаў - меншавікоў здаць свае пазыцыі і прызнаць сваю віну перад пралетарскім судом. Пад націскам клясавага гневу, які ахапіў сусьветны пралетарыят, яны выкрылі сваю ўласную злачынную дзейнасьць і работу іх замежных кіраўнікоў.

Пралетарскі суд разбраіў сацыял-шкоднікаў - меншавікоў, паказаўшы ўсяму сьвету іх прадажніцкі здрадніцкі твар, іх крывавую ролю прыслужнікаў імпэрыялізму.

Заправілы контр-рэвалюцыйнай інтэрвэнцыяністкай шкодніцкай дзейнасьці меншавікі з «Саюзнага бюро» за сваю крывавую дзейнасьць заслугоўваюць толькі вышэйшай меры пакараньня. Але пралетарыят ніколі не карыстаўся і ня будзе карыстацца голай крывавай помстай. Вярхоўны суд у сваёй пастанове па справе контррэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў вынес неабходную меру сацыяльнай абароны супроць ворагаў рэвалюцыі. Пралетарыят і працоўныя масы вітаюць і поўнасьцю ўхваляюць гэтую меру.

Далейшым умацаваньнем абароназдольнасьці краіны, патраеньнем тэмпаў у выкананьні і перавыкананьні пляну пяцігодкі адказваюць працоўныя Савецкага саюзу на крывавую шкодніцкую інтэрвэнцыяністкую дзейнасьць агентуры міжнароднага імпэрыялізму - меншавікоў, якія імкнуліся вярнуць у нашай краіне «рай» капіталістычнага рабства, зрабіць нашу краіну калёніяй сусьветнага капіталізму.

ПРЫГАВАР СПЭЦЫЯЛЬНАЕ ПРЫСУТНАСЬЦІ ВЯРХОЎНАГА СУДУ САЮЗУ ССР

ПА СПРАВЕ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНШАВІКОЎ*)

Імем Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік спэцыяльная судовая прысутнасьць Вярхоўнага суда Саюзу ССР, у складзе старшыні М. М. Швэрніка, членаў—М. К. Муранава і В. П. Антонава-Сарата ўскага, пры сакратарох Г. Р. Смоліцкім, Н. Д. Дуброўскім і М. Ф. Якаўлеве, з удзелам дзяржаўных абвінаваўцаў—пракурора РСФСР Н. В. Крыленка і памочніка пракурора РСФСР—Г. К. Рагінскага і абароны—членаў Маскоўскай калегіі абаронцаў—Камодава Н. В. і Браўдэ І. Д., разгледзеўшы на адкрытым судовым пасяджэньні з 1 па 9 сакавіка 1931 году справу контр-рэвалюцыйнай арганізацыі—«Саюзнае бюро» ЦК РСДРП (меншавікоў) па абвінавачваньні:

Громана Ў. Г., Шэра В. У., Суханава М. М., Гінзбурга А. М., Якубовіча М. П., Сакалоўскага А. Л., Залкінда Л. Б., Воўкава І. Г., Пятуніна К. Г., Фін-Енатаеўскага А. Ю., Бэрлацкага Б. А. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58-7, 58,4 Крымінальнага Кодэксу РСФСР.

Ікава Ў. К. і Тэйтэльбаума М. І. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58-4 Крымінальнага Кодэксу РСФСР.

Рубіна І. Л. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58,4, 58,10 КК РСФСР.

Заслухаўшы паказаньні падсудных і сьведак, апрэчкі бакоў, разгледзеўшы ўсе матэрялы, што маюцца па справе, спэцыяльнай судовай прысутнасьцю ўстаноўлена:

У другой палове 1930 г. у Маскве выкрыта шкодніцкая арганізацыя, якая мела свае адгалінаваньні ў розных частках дзяржаўнага апарату. На чале гэтай арганізацыі стаяла група, якая аказалася «Саюзным бюро» Цэнтральнага Камітэту расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), уваходзячых у склад 2-га Інтэрнацыяналу ў якасьці яго сэкцыі. Азначанае бюро арганізавалася і зацьверджана сваім Цэнтральным Камітэтам у пачатку 1928 г. У склад бюро ўвайшлі найбольш выдатныя ў сваім асяродзьдзе сацыял-дэмакраты (меншавікі), якія займалі, у большасьці, адказныя пасады ў цэнтральных установах савецкай дзяржавы, а іменна: В. Г. Громан, В. В. Шэр, А. М. Гінзбург, А. Л. Сакалоўскі, Л. Б. Залкінд, М. П. Якубовіч, І. Г. Волкаў, К. Г. Пятунін, А. Ю. Фін-Енатаеўскі і з пачатку 1929 г. М. М. Суханаў, прычым, кіруючымі асобамі сярод іх былі: **Громан, Шэр, Гінзбург, Суханаў.**

Для вядзеньня шкодніцкай і контррэвалюцыйнай работы бюро мела прэзыдыум, пленум і ряд камісій: праграмную, арганізацыйную, ваенную і фінансавую.

Хаваньне партыйных дакумантаў было ўскладзена на сакратароў «Саюзнага бюро»—**Шэра і Рубіна**, друкаваньне тэхнікай ведаў **Якубовіч.** Для ўвязкі сваёй дзейнасьці з дзейнасьцю заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), месца прабываньня якога знаходзілася ў Бэрліне «Саюзнае бюро» ўстанавіла праз членаў сваёй арганізацыі **В. К. Ікава і А. Ю. Фін-Енатаеўскага** рэгулярныя пісьмовыя адносіны, а праз падарожных членаў бюро (**Громана, Пятуніна, Гінзбурга і іншых**) заграніцу і членаў заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) (Абрамовіча, Браўнштэйна і інш.) у Маскву—сувязь непасрэдную. У цесным узаемадзеяньні паміж «Саюзным бюро» і заграніччным меншавіцкім цэнтрам у апошніх гады была выпрацавана новая тактыка барацьбы расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) супроць савецкай улады. Зьяўляючыся працаўнікамі пралетарскай дыктатуры, прыхільнікамі аднаўленьня капіталізму ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных рэспублік, што выяўляецца з іх пляцформы, прынятай у Бэрліне ў 1924 г., палітычна збанкрутаваўшыя ў перыяд рэвалюцыі, удзельнікі грамадзянскай вайны на баку царскіх генэралаў, капіталістаў і інтэрвэнтаў, страціўшыя ўсякую глебу ў рабочай клясе,—расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) разьлічвалі на перараджэньне савецкай улады, на аднаўленьне капіталізму ў рэзультаце НЭП'у. З прычыны таго, што гэтыя разьлікі не апраўдаліся, а савецкая ўлада павяла рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты, пасьпяхова будуючы сацыялізм у сваёй краіне, расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) перайшлі да новай тактыкі—накіраванай на **зьвяржэньне савецкай улады шляхам шкодніцтва ў сацыялістычнай гаспадарцы, пры дапамозе ўзброенай інтэрвэнцыі. Судовае сьледзтва ўстанавіла, што шкодніцтва праводзілася ўсімі членамі «Саюзнага бюро»**, членамі асобных шкодніцкіх ячэек, створаных сацыял-дэмакратамі (меншавікамі) ў радзе савецкіх устаноў. Шкодніцтва гэта зводзілася да наступнага:

А. У дзяржаўнай плянавай камісіі: правядзеньне ў кантрольных лічбах, кан'юнктурных агляданх народнай гаспадаркі заведама варожых палітыцы савецкай улады плянавых пабудоў, заводам скажоных кан'юнктурных ацэнак, адстойваньне ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы і іншых галінах народнай гаспадаркі мерапрыемстваў, якія прыводзілі да тармажэньня, да заведамага зрыву і дэзарганізацыі гэтых галін народнай гаспадаркі. (Громан).

Б. Па ВСНГ: праектоўка росту прадукцыі па пяцігадовым плане давалася, у мэтах зрыву сацыялістычнага будаўніцтва, у мінімальных разьмерах, у асаблівасьці па такіх вядучых галінах народнай гаспадаркі, як мэталь, вугаль, нафта, хэмія, электратэхніка, а таксама с.-г. машынабудаўніцтва, штучнае ўгнаеньне (**Гінзбург**).

Распрацоўка і прадотаўленьне такіх кан'юнктурных агляданў па прамысловасьці, якія ня толькі не садзейнічалі сацыялістычнаму будаўніцтву, але заблытвалі кіруючыя гаспадарчыя колы (**Гінзбург**), супроць дзеяньне ажыцьцяленьню ўзятых савецкай уладай тэмпаў разьвіцьця мэталюргічнай і машынабудаўнічай, мэталяапрацоўчай прамысловасьці шляхам затрыманьня разьвіцьця заводаў гэтай прамысловасьці і, ў прыватнасьці, заводаў-гіганта ў—Магнітагорскага, трактарнага Сталінградзкага (і мазбург), устанаўленьне разрыву паміж тэмпамі фінансаваньня і тэмпамі будаўніцтва ў галіне машынабудаўніцтва, у прыватнасьці, недафінансаваньне Ленінградзкага машынабудаўнічага трэсту, Сталінградбуду, Растоўскага заводу сельска-гаспадарчых машын (Воўкаў), пабудова і правядзеньне мінімалісцкіх тэмпаў па сыроцовай пяцігодцы, у асаблівасьці па бавоўне (Сакалоўскі).

В. Па дзяржаўным банку: правядзеньне, у мэтах разбурэньня народнай гаспадаркі і грашовага звароту ў краіне, заведама шкадальнага разьмеркаваньня крэдытаў (**Шэр**), у мэтах зрыву крэдытнай рэформы шкодніцкімі сацыял-дэмакратамі (меншавікамі) заведама ня ўжывалися меры па падрыхтоўцы крэдытнай рэформы, сваячасова не пасылаліся цыркуляры на месцы, або мелі заведамую няяснасьць дырэктыў, чым уносілі разбурэньне ў сістэму крэдытаваньня (**Шэр**), заведама расхістваллі вучот і статыстыку банку, што паслабляла нагляд банку за запазычанасьцю гаспадарчых органаў і пазбаўляла банк тэй мажэўранасьці, якая была патрэбна яму ў барацьбе з парушыцелямі пляну (**Бэрлацкі**).

Г. Па Народным камісарыяце гандлю і Цэнтрасаюзе: шкоднікі—сацыял-дэмакраты (меншавікі), у мэтах выкліканьня нездавальненьня сярод працоўных гораду і вёскі, а таксама ў мэтах зрыву загатоўчых апэрацый, складалі такія пляны завозу тавараў у вёску, пры якіх атрымлівалася пераазабесьпячэньне адных раёнаў і недазабесьпячэньне другіх, накіроўваліся тавары не да сэзону або неадпавядальны попыту асартымэнт, прычым, сыстэматычна праводзілі недазабесьпячэньне таварамі рабочых цэнтраў і раёнаў (**Залкінд, Якубовіч, Пятунін**). Фінансаваньне спажывецкай каапэрацыі было пастаўлена так, што значна замаруджваўся тавараварот каапэрацыі, што выклікала неабходнасьць крэдытаваньня яе за кошт дзяржаўнага банку (**Шэр**).

Д. Па Цэнтрасаюзе: павышэньне нацэнак, якія адбіваліся на рэальнай заработнай плаце; утоўваньне сродкаў каапэрацыі, у прыватнасьці, разьмераў бягучага капіталу; невыкананьне пастановы ўраду па звароце каапэрацыяй сродкаў, у свой час адпушчаных ёй урадам; згортваньне тэмпаў капітальнага каапэрацыйнага будаўніцтва, у выніку чаго здарыўся прарыў у будаўніцтве нафтахаваленьняў; затрыманьне ў складаньні будаўнічых праектаў; супрацьўленьне уключэньню спажывецкай каапэрацыі ў сфэру дзеяньняў крэдытнай рэформы.

Судовае сьледзтва ўстанавіла, што, ня маючы ніякай апоры сярод рабочае клясы ў бяднякоў-серадняцкіх масах вёскі; пацярпеўшы няўдачу ў спробах нават шляхам шкодніцтва выклікаць нездавальненьне ў масах, узьняць іх супроць савецкай улады,—расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) прышлі да прызнаньня **неабходнасьці інтэрвэнцыі і ўзмацненьня шкодніцкай работы ў мэтах актыўнай падрыхтоўкі яе.** Гэта ўстаноўка на інтэрвэнцыю ўзьнікла і ў «Саюзнага бюро» і ў заграніччным цэнтры расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), прычым, апошні настойліва высоўваў гэту ўстаноўку перад «Саюзным бюро».

Ужо ў канцы 1927 г. **Абрамовіч і Дан**—кіруючыя асобы заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), паставілі перад «Саюзным бюро» гэта пытаньне. Улетку 1928 году Абрамовіч, нелегальна прыехаўшы ў Маскву, на нарадзе «Саюзнага бюро» настойваў на прыняцьці інтэрвэнцыі, як адзінага выхаду для расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) у іх барацьбе супроць савецкай улады. «Саюзнае бюро» прасіла Абрамовіча прыслаць з-заграніцы пісьмовую дырэктыву па гэтым пытаньні; такая дырэктыва была дастаўлена праз Ікава. Прыехаўшы ў 1929 г. таксама, як і Абрамовіч, нелегальна ўпаўнаважаны таго-ж заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) Браўнштэйн яшчэ раз пацьвердзіў, што **заграніччны цэнтр узяў курс на інтэрвэнцыю і патрабуе ад «Саюзнага бюро» самай актыўнай работы ў гэтым напрамку.** Другі пленум «Саюзнага бюро» ўвосень 1929 году абмеркаваў дырэктыву аб інтэрвэнцыі і прыняў пастанову аб тым, што **«інтэрвэнцыя зьяўляецца неабходнаў зброяй барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту і савецкай улады» і з гэтага часу ўся работа «Саюзнага бюро» была падпарадкавана гэтай пастанове.** Судовае сьледзтва ўстанавіла, што прыняцьце курсу на інтэрвэнцыю і шкодніцтва, як сродак яе падрыхтоўкі, прывяло расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) да заключэньня цеснага палітычнага блёку з кулацка-эсэраўскай контррэвалюцыйнай партыяй Кандрацьева-Чаянава і «прамысловай партыяй», якая зьяўлялася інтэрвэнцыяністкай шпіёнска-шкодніцкай арганізацыяй буйной буржуазіі. Усе гэтыя контррэвалюцыйныя арганізацыі на суполнай нарадзе сваіх кіраўнікоў у пачатку 1929 году разьмеркавалі паміж сабой функцыі барацьбы з савецкай уладай, а іменна: **«прамысловая партыя» ўзяла на сябе** праз пасрэдніцтва арганізацыі рускіх буйных капіталістаў што ўцяклі ад пралетарскай рэвалюцыі, якая (арганізацыя) знаходзіцца ў Парыжы (Манташава, Дзянісава, Рабушынскага, Гукасава, Канавалава, Но беля і іншых) і называе сябе «Торгпромам»—**перагаворы з інтэрвэнцыяністкімі ўрадамі і іх генэральнымі штабамі аб арганізацыі падрыўных (дывэрсыйных) груп, фармаваньне контррэвалюцыйных элемэнтаў сярод інжынэрна-тэхнічнай інтэлігенцыі, шкодніцтва па галінах прамысловасьці; кулацка-эсэраўская партыя Кандрацьева-Чаянава ўзяла на сябе арганізацыю кулацкіх паўстаньняў, забесьпячэньне паўстанцаў зброяй і харчамі, арганізацыйную работу і контррэвалюцыйную работу сярод спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, шкодніцтва ў галінах гэтай гаспадаркі.**

Рускія сацыял-дэмакраты (меншавікі) з адабрэньнем свайго заграніччнага цэнтру **ўзялі на сябе шкодніцтва ў** агульным і спэцыяльным планаваньні народнай гаспадаркі і канкрэтнае шкодніцтва ў галіне загатовак збожжа, сырцу для прамысловасьці, разьмеркаваньня прамысловых тавараў, рабочага забесьпячэньня, а таксама ў галіне фінансаваньня крэдыту і апарата таго, яны абавязаліся пры пасрэдніцтве свайго заграніччнага цэнтру і II інтэрнацыяналу ўжыць меры па падрыхтоўцы такой грамадзкай думкі працоўных, у асаблівасьці сусьветнага пралетарыяту, пры якой інтэрвэнцыя ў краіне Саветаў ня сустрэла-б з іх боку супраціўленьня.

Судовае сьледзтва ўстанавіла, што для ажыцьцяўленьня шкодніцкай работы і аплаты непасрэднага шкодніцтва расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікі) дагаварыліся з контррэвалюцыйнай арганізацыяй буйной буржуазіі—«прамысловай партыяй» аб атрыманьні ад яе грашовай дапамогі, што накіроўвалася з Парыжу ад «Торгпрома» і зьвязаных з ім імпэрыялістычных колаў і праз казначэя Цэнтральнага Камітэту «прамысловай партыі», Ларычава, **атрымалі на працягу 1929-30 г. 200 тысяч рублёў.**

Другой крыніцай фінансаваньня шкодніцкай работы расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) **была нямецкая сацыял-дэмакратыя і 2 Інтэрнацыянал.** Гропы з гэтай крыніцы накіроўваліся «Саюзнаму бюро» праз заграніччны цэнтр рускіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) і тэхнічна праз Фін-Енатаеўскага і **Громана.**

З гэтай крыніцы «Саюзным бюро» Цэнтральнага Камітэту расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) было атрымана **280 тысяч рублёў;** апрача таго, у пачатку шкодніцкай дзейнасьці былі атрыманы 210 тысяч рублёў пераданых праз Шурыпіна Пятуніным і 135 тыс. руб. ад «прамысловай партыі» праз Шэйна Залкіндам. **Усяго было атрымана 515 тыс. руб.**

Побач з тэтым, на судовым пасяджэньні высьветлілася, што сваю злачынную контррэвалюцыйную работу па падрыхтоўцы інтэрвэнцыі і фінансаваньні ў тэтых мэтах шкодніцкай работы «Саюзнага бюро» замежны цэнтр расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) праводзіў з ведама і згоды II Інтэрнацыяналу, які прыкрываў гэту работу і аказваў праз нямецкую сацыял-дэмакратыю ім грашовую дапамогу. У той-жа час II Інтэрнацыянал (Вэлс, Гільфэрдынг, Блюм), двурушніцкі выступаючы супроць інтэрвэнцыі, разьвіваў контррэвалюцыйную дзейнасьць супроць СССР, падрыхтоўваючы тым грамадзкую думку рабочых да вызначанай інтэрвэнцыі, дапамагаючы гэтым драпежніцкім замыслам імпэрыялістаў супроць СССР.

На падставе артыкулу 326, часткі 3, Крым. К. РСФСР спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага суда Саюзу ССР прыгаварыла:

Тэйтэльбаума, Майсея Ісаевіча — да пяці гадоў пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох на два гады.

Рубіна, Ісаака Ільліча—да пяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на два гады.

Воўкава, Івана Рыгоравіча—да пяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на два гады.

Сакалоўскага, Арона Львовіча — да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох, тэрмінам на тры гады.

Залкінда, Лазара Барысавіча — да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на тры гады.

Бэрлацкага, Барыса Маркавіча — да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на тры гады.

Ікава, Уладзімера Кастусёва — да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на тры гады.

Пятуніна, Кірылу Гаўрылавіча — да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Фін-Енатаеўскага, Аляксандра Юльевіча—да 10 г. пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Якубовіча, Міхайла Пятровіча — да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Гінзбурга, Абрама Майсеевіча — да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Суханава, Мікалая Мікалаевіча—да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Шэра, Васіля Ўладзімеравіча — да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Громана, Уладзімера Густававіча—да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох тэрмінам на пяць год.

Мсім прыгавораным залічыць тэрмін папярэдняга заключэньня. Прыгавор канчатковы і абскарджаньню не падлягае.

Старшыня спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага Суда СССР
Н. ШВЭРНІК.
Члены суда МУРАНАЎ.
АНТОНАЎ-САРАТАЎСКІ.

Прыгавор пралетарскага суду над сацыял-шкоднікамі—

ПРЫГАВОР МІЛЬЁНАЎ ПРАЦОЎНЫХ СССР, СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Поўнасьцю ўхваляем прыгавор нашага пралетарскага суду

Прыгавор пралетаскага суду над контррэвалюцыйнымі меншавікамі сустрэў гарачае адобраньне сярод нас, рабочых-друкароў - сталінцаў. Мы пільна сочым за ўсімі пройскамі міжнародных інтэрвэнтаў Брыянаў, Пуанкарэ, Пільсудзкіх, Кауцкіх, Абрамовічаў і К°. Мы разумеем, што расійскі меншавізм ,уся міжнародная сацыял-дэмакратыя і яе II жоўты інтэрнацыянал зьяўляецца вернай агентурай сусьветнага капіталізму, актыўнымі вастрэльшчыкамі інтэрвэнцый супроць СССР. Суд над меншавікамі -і інтэрвэнтамі яшчэ з большай яскравасьцю выявіў усю здрадніцкую дзейнасьць меншавікоў, іх цеснае супрацоўніцтва з «Прампартыяй» кандрацьеўцамі, «Гандльпромам» і інш. інтэрвэнтамі. Меншавікі рабілі стаўку абаперціся на ўсе контр-рэвалюцыйныя элемэнты ўнутры нашае краіны: на кулацтва, на беларускіх нацыянал - дэмакратаў, якія зьнішчаюцца нашым пераможным сацыялістычным будаўніцтвам. Меншавікі і інтэрвэнты імкнуліся знайсьці прыхільны сабе элемэнт з рабочых друкароў, але яны тут пралічыліся.

Мы, друкары - сталінцы запэўніваем камуністычную партыю, што мы на першы заклік гатовы стаць на абарону СССР. Мы ўхваляем прыгавор нашага пралетарскага суду над контрэвалюцыйнымі меншавікамі, патраёвем і надалей прасякаць вострым пралетарскім мячом контр-рэвалюцыйныя спробы адкідваючых клясаў у СССР.

Мы бяром на сябе абавязак выканаць і перавыканаць праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Мы зараз з яшчэ большай энэргіяй і энтузіязмам штурмуем прарывы ў нашым прамфінпляне першага кварталу. Мы бяром абавязак правесьці камуністычны суботнік у дапамогу чыгуначнікам.

Мы заўсёды гатовы на барацьбу з усякімі ўхіламі ад ленінскай лініі партыі.

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва!

Агульны сход супрацоўнікаў інстытутаў Мовазнаўства, Літаратуры, Гісторыі і Яўсэктару Беларускай Акадэміі Навук цалкам і поўнасьцю ўхваляе прыгавор Вярхоўнага Суду над контр-рэволюцыянэрамі інтэрвэнцыяністкім так званым «Саюзным Бюро» ЦК РСДРП меншавікоў. Адначасна сход падкрэсьлівае што савецкай уладзе, якая дасягнула ня чуваных у гісторыі чалавецтва моцы і якая можа жорстка распраўляцца са сваімі клясавымі ворагамі, неўласьцівы пачуцьці помсты. Сход адзначае, што расійскія меншавікі, як ўся ограя міжнародных сацыял-фашыстаў на чале з II інтэрнацыяналам зьяўляюцца актыўнымі ворагамі пралетарыяту, застрэльшчыкамі інтэрвэнцыі супроць СССР—баць каўшчыны сусьветнага пролетарыяту.

Пролетарскі суд над так званым «Саюзным Бюро» ЦК РСДРП меншавікоў поўнасьцю ўскрыў і выявіў перад пролетарыятам, шырокімі масамі працоўных усяго сьвету усю зрадніцкую, шкодніцкую, контр-рэволюцыйную работу меншавікоў і сацыял-фашысцкага II інтэрнацыяналу, якая накіравана на зрыў пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, на рэстаўрацыю капіталізма ў СССР, на крывавую расправу з рабочаю клясаю і працоўнымі масамі. Контр-рэвалюцыйныя організацыі праводзілі інтэрвэнцыяністкую работу у цесным саюзе з замежнымі нацыянал-фашыстымі і лёкаямі буржуазіі сацыял-фашыстымі розных буржуазных краін.

Мы, працаўнікі створанай пролетарыятам Акадэміі, з абурэньнем пратэстуем супроць контр-рэволюцыйнай, шкодніцкай работы тых «учоных», якія з падрыўной мэтай пралазілі ў пролетарскія Акадэміі Саюзу. Сход заявяе комуністычную партыю, што супрацоўнікі інстытутаў аддадуць усе свае сілы, усю энэргію і веды для абароны СССР, для пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, для перабудаваньня Акадэміі ў цытадэлю пролетарскай навукі.

Няхай жыве комуністычная партыя кіраўнік і організатар сацыялістычнага будаўніцтва.

Вітаем прыгавор над сацыял-шкоднікамі

Заслухаўшы інфармацыю аб прысудзе над контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй меншавікоў, мітынг рабочых і служачых Чырвонаштандарнага Скурзаводу «Бальшавік» канстатуе:

Контррэвалюцыянэры - меншавікі—гэта агенты II жоўтага інтэрнацыяналу, які зьяўляецца арганізатарам агідных нападаў на Савецкі саюз. Верны прыслужнік буржуазіі, II інтэрнацыянал робіць усё залежачае ад яго, каб патапіць у моры крыві усе завадёвы працоўных.

Спэцыяльны склад Вярхоўнага суду СССР з бязумоўнай яснасьцю выкрыў усю агідную сувязь здрадніцкаўшысцкага II інтэрнацыяналу, якая накіравана на зрыў пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, на рэстаўрацыю капіталізма ў СССР, на крывавую расправу з рабочаю клясаю і працоўнымі масамі.

Мітынг рабочых заводу шчыра вітае прыгавор над агіднай шайкай інтэрвэнтаў - меншавікоў.

Згуртуем нашы рады вакол нашае партыі для выкананьня вялікіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве штаб сусьветнай рэвалюцыі—Камінтэрн!

Няхай жыве АДПУ!

Да 14-й гадавіны нізрынуцьця самаўладзтва

Роўна 14 год таму назад была нізрынута царская ўлада—апора міжнароднай рэакцыі. Лютаўская рэвалюцыя паклала канец дынастыі дому Раманавых, пазбавіла расійскі пралетарыят і працоўнае сялянства ад паліцэйскай і жандарскай сваволі, пазбавіла ад адвечнага і эканамічнага прыгнечаньня акраінных народнасьці, якія знаходзіліся ў складзе «единой и неделимой Российской Империи». Нізрынуцьце царскага дэспатызму адкрыла шыратэзны шлях да яшчэ больш шырокага разгортваньня рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту, які пры актыўнай дапамозе асноўных мас сялянства прайшоў праз тры рэвалюцыі і зараз пасьпяхова пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будуе сацыялізм.

Царская машына, якая на працягу трох вякоў зьяўлялася магутным сродкам у руках абшарнікаў і буржуазіі па эксплёатацыі працоўных мас, у справе прыдушэньня рэвалюцыйнага руху ня толькі расійскага, але і эўрапэйскага пралетарыяту, прымушана была змоўкнуць, прымушана была спыніць сваю работу. Рэвалюцыя 1905 году нанесла самаўладзтву жорсткі ўдар. Апраўшыся ад гэтага ўдару, самаўладзтва з усёй сілай абрушылася на рэвалюцыйны пралетарыят і яго партыю, запоўніла турмы і казематы яе лепшымі пралетаўнікамі, арганізавала крывавыя экспэдыцыі, перад якімі была пастаўлена задача—задушыць рэвалюцыйны рух, спыніць барацьбу пралетарыяту за свае вызваленьне і вызваленьне ўсіх працоўных. Гэты перыяд у гісторыю рэвалюцыйнай барацьбы расійскага пралетарыяту ўвайшоў як перыяд страшэннай рэакцыі.

Але самаўладзтва, якое прадстаўляла сабой інтарэсы абшарнікаў і капіталістаў, і на гэты раз памылілася. Загнаная ў падпольле партыя рабочае клясы ў барацьбе з меншавізмам і ўсімі дробна-буржуазнымі партыямі, у барацьбе з адхіленьнямі ад марксыцка ленінскага вучэньня аб клясавай барацьбе, гартавала сябе для новых і канчатковых сутычак з царска-абшарніцка-капіталістычнай сыстэмай, падрыхтоўвала да гэтых сутычак пралетарыят і працоўныя масы. Праробленая работа партыі бальшавікоў па арганізацыі і згуртаваньня пралетарскіх і працоўных мас не прайшла дарма. 1910-12 г. г. прынесьлі новы магутны ўздым рэвалюцыйнай хвалі, якая ахапіла сабою пераважную большасьць прамысловых цэнтраў, дайшла нават да глухіх вёсак. Бачачы ў разгортваньні рэвалюцыйнага руху сур'ёзнага пагрозу для свайго існаваньня, навучаная горкім вопытам першай рэвалюцыі, царская ўлада пачала шукаць выхаду са ствараўшагася становішча і гэты выхад быў знойдзены ў актыўным удзеле па арганізацыі сусьветнай бойні.

Тав. Ленін ні адзін раз цытаваў вядатны артыкул Энгельса аб будучай сусьветнай вайне, у якім

СПРАВАЗДАЧА УРАДУ САЮЗУ ССР

Даклад Старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР тав. В. М. Молатава (Скрабіна)

З часу V зьезду саветаў адбыліся буйнейшыя зьмены ўнутры СССР і ў міжнародным становішчы. Нам гэта важна з пункту гледжаньня зьмены суадносін клясавых сіл у Савецкім Саюзе і ва ўзаемаадносінах СССР з капіталістычным абкружэньнем. У чым асноўа адбыўшайся зьмены ў суадносінах клясавых сіл у нашай краіне? Адказаць на гэта ня цяжка. Адказу трэба шукаць у зьмене ролі сацыялістычных элемэнтаў у нашай гаспадарцы.

У выніку сацыялістычнай індустрыі, росту саўгасаў і калгасаў у вёсцы, сацыялістычны сэктар атрымаў абсалютную перавагу ў нашай народнай гаспадарцы. Гэтага ў нас ня было к часу V зьезду саветаў, але да сучаснага моманту рост сацыялістычных элемэнтаў у нашай краіне зусім відавочны. Гэтым у асноўным і вызначаюцца цяперашнія суадносіны клясавых сіл унутры СССР. Але, з другога боку, гэтая зьмена ўнутры краіны мае рашаючае значэньне і для ўзаемаадносін СССР з капіталістычным абкружэньнем.

Посьпехі будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, асабліва ў сувязі з абсалютнай перавагай сацыялістычнага сэктару, якая ўстанавілася ў нашай гаспадарцы, і вызначаюць узаемаадносіны СССР з капіталістычным сьветам. Нябачаны ўздым сацыялізму ў Савецкім Саюзе супаў з пэрыядам глыбачэзнага крызісу ў краінах капіталізму. Гэта вядзе да супярэчнасьцяй у разьвіцьці СССР і сусьветнага капіталізму, з прычыны прынцыповага разьвіцьця гэтых двух грамадзкіх сыстэм. Ва ўмовах сусьветнага крызісу, які разгортваецца, зьмены, што адбыліся ў суадносінах клясавых сіл унутры СССР, з асаблівай рэзкасьцю знаходзяць свой адбітак у зьмене адносін СССР са зьнешнім абружэньнем. Каб падкрэсьліць розьніцу паміж сучасным пэрыядам і пэрыядам V зьезду саветаў, досыць спыніцца на самым асноўным. Гэтым асноўным зьяўляецца паварот рашаючых мас сялянства на шлях калектывізацыі. Тады, у пэрыяд V зьезду, пытаньне аб сацыялістычнай перабудове вёскі было пастаўлена рубам перад усім ходам нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта быў для нас рашаючы момант у барацьбе за серадняка, у барацьбе за калектывізацыю ў вёсцы. Але гэтае пытаньне ў той момант яшчэ ня было вырашана; пералому ў серадняцкай масе мы яшчэ ня мелі; кулак, шалёна супраціўляючыся, імкнуўся перайсьці ў контрнаступленьне. Нават у радох бальшавіцкай апартуністычныя хістаньні яшчэ былі моцныя. Правыя элемэнты працягвалі свае ўзмоцненыя наскокі на палітыку партыі. Клясавыя ворагі злясьмешна пацісканалі рукі, разьлічваючы на блізкі крах савецкай улады. Але ў рабочай клясе ўжо да таго часу ясна вызначаўся пералом у бок разгортваньня сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце. Досыць зазначыць на факт сацыялістычнага спаборніцтва, якое менавіта, у першай палове 1929 г. пераварылася ў шырокі масавы рух рабочых. Гэты пералом у авангардзе працоўных—ў рабочай клясе, быў вястуном пералому і ў настроях сялянскіх мас. І, сапраўды, у другой палове 1929 году канчаткова вызначыўся паварот серадняцкіх мас на шлях калектывізацыі. За апошнія гады калгасны рух хутка павялічваўся, але ўвосені 1929 г. ён узьняўся на новую, рашаючую ступень. З гэтага моманту ён пачаў пераўтварацца ў суцэльную калектывізацыю цэлых раёнаў, спачатку невялікіх, а затым і вялізарных па сваіх разьмерах і гаспадарчым значэньні. На аснове суцэльнай калектывізацыі і наступленьня на кулака перадавыя раёны перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы. У выніку гэтага цяпер, у часе V зьезду саветаў, мы маем становішча, якое карэнным чынам адрозьніваецца ад становішча ў пэрыяд мінулага зьезду.

Мы дабіліся таго, што ў сялянскіх масах адбыўся паварот на шлях сацыялістычнай перабудовы, паварот у бок сацыялізму. Цяпер мы маем такое становішча, што сацыялістычны сэктар ужо пануе ў народнай гаспадарцы, а капіталістычныя элемэнты (кулацтва), якія нядаўна яшчэ мелі вядомы рост, ідуць да ліквідацыі. Гэта вызначае карэнную зьмену ў вёсцы, якая адбылася за апошнія паўтара года. Посьпехі будаўніцтва сацыялізму дазваляюць цяпер па новаму адказаць на пытаньне аб тым, куды ідзе СССР? Адказам на гэта пытаньне зьяўляецца той факт, што мы ўступілі ў пэрыяд непасрэднага сацыялістычнага будаўніцтва, у пэрыяд сацыялізму. Гэта значыць, што з пункту гледжаньня ўнутраных сіл пытаньне аб перамозе сацыялізму ў нашай краіне вырашана і перамога сацыялізму цалкам забясьпечана. (Воплескі).

Выкананьне пастаўленых народнагаспадарчым плянам бягучага году задач азначае пераход на менш паловы сялянскіх гаспадарак на шлях калектывізацыі. Гэта разам з выкананьнем другіх задач сацыялістычнага будаўніцтва сучаснага году забясьпечыць нам пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. (Воплескі). Пад гэтым сьцягам мы і разгортваем цяпер наша сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, наўпрэкі шалёнаму супраціўленьню, якое працягваецца, капіталістычнымі элемэнтамі.

Клясавы вораг унутры СССР, які штодня трацiць свае сілы, з асаблівай настойлівасьцю імкнецца абаперціся на падтрыманьне зьнешніх буржуазных сіл. Рашучае прасоўваньне сацыялізму ў СССР наперад няўхільна зьвязана таму з абвастрэньнем барацьбы па між СССР і варожым яму імпэрыялістычным абкружэньнем. Менавіта цяпер, калі ажыцьцяўленьне сацыялізму ў СССР, усё больш спляцаецца з задачамі барацьбы супроць усіх і усякіх спробаў міжнародняй буржуазіі перашкодзіць нашай справе. На ўсе больш адкрытыя спробы арганізаваць эрыў будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне з боку ваяўнічага міжнароднага імпэрыялізму мы павінны адказаць не абходнай падрыхтоўкай да барацьбы. (Воплескі). Усе гэта патрабуе бальшавіцкага вучоту ўнутраных і міжнародных клясавых сіл, іх суадносін, зьмен, якія адбываюцца ў гэтай галіне. У такі момант небясьпечна перавялічэньне сваіх сіл, пасьпешнасьць і неабдуманасьць сваіх крокаў. У выніку мы не забясьпечылі-б неабходнасьці своечасовай падрыхтоўкі сіл, што ў момант іспытаньняў вядзе да разгрому. Ня ў меншай меры для нас недапусьціма недаацэнка сваіх сіл і магчымасьцяй у барацьбе за справу сацыялізму. Яна вядзе да страты тэмпаў, а эрыў тэмпаў нашага будаўніцтва зьяўляецца рашаючым момантам у плянах нашых зьнешніх ворагаў. Таму нам нельга забываца аб тым, што ў сучасных умовах эрыў тэмпаў—рызыка галавой, рызыка савецкай уладай.

I. Барацьба за мір і міжнароднае становішча СССР

1. Паглыбленьне сусьветнага крызісу і абвастрэньне супярэчнасьцяй капіталізму

Глыбачэзны эканамічны крызыс, які разгортваецца зараз у капіталістычных краінах вядзе да выключнага абвастрэньня ўсіх супярэчнасьцяй капіталізму. Цяпер ясна, што даная камуністамі ў пачатку сусьветнага эканамічнага крызісу ацэнка цалкам пацьвердзілася. Наўпрэкі думцы буржуазных эканамістаў і дзяржаўных дзеячоў, крызис на працягу паўтара год ня толькі не зьмякчыўся, але працягвае паглыбляцца. Досыць некалькі лічбаў, каб пацьвердзіць гэты вывад.

Па буйнейшых капіталістычных краінах, у параўнаньні з вышэйшым пунктам разьвіцьця прамысловасьці бы крызісу (г. зн. па адносінах да сярэдзіны 1929 г.) мы маем наступнае скарачэньне вытворчасьці да пачатку бягучага году: па Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах скарачэньне вытворчасьці на 32 проц., па Нямеччыне—скарачэньне вытворчасьці на 28 проц., па Англіі—скарачэньне вытворчасьці на 19 проц., па Польшчы—скарачэньне вытворчасьці на 25 проц., па Францыі, дзе крызис пачаў разгортвацца некалькі пазьней,—скарачэньне вытворчасьці пакуль на 7 проц. Даныя ўзятыя для ПАЗШ з «Аналіста» ад 14-II—1930 г. і 13-II 1931 г., для Англіі—з «Эканамістаў» ад 31-I 1931 г., а для другіх краін з бюлетэня Лігі Нацый—«Бюлетэнь Мансіоэль дэ-Статыстык» ад студзеня 1930 г. і 1931 г. Вышэйшы пункт да крызісу прыняты для ПАЗШ—1929 г., для Нямеччыны—чэрвень 1929 г., для Англіі—IV квартал 1929 г., для Польшчы—студзень 1929 г., для Францыі—май 1930 г.).

Адначасова з прамысловым крызісам адбываецца далейшае паглыбленьне аграрнага крызісу. Апошні знаходзіць сваё выражэньне ў небывалым і проста катастрафічным зьніжэньні цэн. Аптовыя цэны раду важнейшых прадуктаў сельскае гаспадаркі, ад якіх залежаць даходы еоцен мільёнаў сялян усяго капіталістычнага сьвету, зьнізіліся да паловы і нават адзнай трэцяй сваёй ранейшай цаны. Яны каштуюць вельмі часта ніжэй выдаткаў, затрачаных на выраб сельска-гаспадарчых прадуктаў. Такі ўзровень цэн б'е са страшэннай сілай па сотнях мільёнаў сялянскіх гаспадарак. Сусьветныя запасы важнейшых прамысловых і сельска-гаспадарчых тавараў за мінулы год значна павялічыліся і побач з гэтым да нябачаных разьмераў павялічылася беспрацоўе і агаленьне ў гарадох і сельскіх мясцовасьцях капіталістычных краін і іх калёній.

Паказьнікам сусьветнага характару крызісу зьяўляецца таксама рэзкае скарачэньне як вывазу, так і ўвозу ўсіх без выключэньня капіталістычных краін у 1930 г.

Калі год таму назад, г. зн. к пачатку крызісу, было ня мала людзей у капіталістычных краінах, якія давалі веры аптымістычным заявам буржуазных урадаў аб хуткім сканчэньні крызісу і аб блізкасьці пэрыяду новага «росквіту», дык цяпер нарастае прозіраньне ў тым, што крызис і ва ўсіх краінах, дзе існуе капіталістычны лад. Орган аўстрыйскай буйнай буржуазіі «Нэйе Трэйе Прэсэ» у сваім новагоднім агляде заявляе: «Многіх хвалюе тое страшнае пытаньне—няўжо капіталістычная эканамічная сыстэма вінавата ва ўсіх бядотах?» І сапраўды, узрастаючы сусьветны крызіс узмацняе да крайнасьці супярэчнасьці капіталізму і яшчэ вастрэй ставіць пер д масамі пытаньне аб праве на існаваньне капіталістычнай сыстэмы. У гэтай сувязі зразумела наступная заява правадыра ангельскіх лібэралаў Лёйд Джорджа: «Калі мы ня мелі страхавой дапамогі для беспрацоўных, дык у нашай краіне адбылася б ужо рэвалюцыя.. Вы ня будзеце трымаць сябаку ў сваім памяшканьні, калі ня маеце магчымасьці даць ей хлеба» («Манчэстэр Гардыян», 7 студзеня 1931 г.). У гэтых словах, што вырваліся з душы, знайшла свой яскравы адбітак нянавісьць капіталістаў да рабочае клясы разам з тым страх перад іх узрастаючай сілай.

Ня лепшае становішча стваралася і ў іх міжнародных узаемаадносінах. Нельга сказаць, каб адносіны імэрыялістычных дзяржаў з іх калёніямі за апошнія часы палепшыліся. Ці можна сказаць, што дасягнутыя ў апошнія часы згоды, або пэўзгоды з правадырамі лібэральных індыйскіх абшарнікаў і буржуазіі гарантуюць устойлівасьць уземаадносін і ў самай Індыі, хоць-бы на некаторы тэрмін? Пры тым становішчы, што ва ўмовах жыцьця рабочае клясы і працоўных сялян нават не намецілася якога-небудзь палепшаньня, а, наадварот справа ідзе да ўсё большага і большага пагаршэньня, нельга разьлічваць на ўстойлівасьць у Індыі. Малейшыя спробы да абароны сваіх інтарэсаў у Інда-Кітаі буржуазная французская прэса абвяшчае «бальшавіцкімі козьнямі». Але падобнымі панічнымі лямантамі аб «пагрозе бальшавізму» нельга стварыць трывалага становішча для абароны капіталу, а можна толькі ўзмацніць папулярнасьць бальшавіцкіх ідэй у калёніяльных масах. У Кітаі правадыры генэральскіх зграй супрацоўнічаюць разам з прадстаўнікамі буйнейшых імэрыялістычных дзяржаў, але і тут ужо на працягу раду год пануючыя клясы паказалі сваю бясспомачнасьць у стварэньні ўмоў, неабходных для эканамічнага ўздыму і для палепшаньня становішча мас.

У непасрэдных узаемаадносінах паміж капіталістычнымі краінамі таксама нельга адзначыць сапраўднага перамаганьня няўстойлівасьці няўпэўнасьці ў заўтрашнім дні. Праўда, ідзе бясконцая вазьня прадстаўнікоў буржуазных урадаў вакол выпрацоўкі ўсякага роду згод. Прадстаўнікі пэўных буржуазных колаў Нямеччыны ў «неафіцыйным парадку» намацваюць глебу для згоды ў Парыжы. Афіцыйныя прадстаўнікі Англіі дапамагаюць



стэмы. У гэтай сувязі зразумела наступная заява правадыра ангельскіх лібэралаў Лёйд Джорджа: «Калі мы ня мелі страхавой дапамогі для беспрацоўных, дык у нашай краіне адбылася б ужо рэвалюцыя.. Вы ня будзеце трымаць сябаку ў сваім памяшканьні, калі ня маеце магчымасьці даць ей хлеба» («Манчэстэр Гардыян», 7 студзеня 1931 г.). У гэтых словах, што вырваліся з душы, знайшла свой яскравы адбітак нянавісьць капіталістаў да рабочае клясы разам з тым страх перад іх узрастаючай сілай.

Ня лепшае становішча стваралася і ў іх міжнародных узаемаадносінах. Нельга сказаць, каб адносіны імэрыялістычных дзяржаў з іх калёніямі за апошнія часы палепшыліся. Ці можна сказаць, што дасягнутыя ў апошнія часы згоды, або пэўзгоды з правадырамі лібэральных індыйскіх абшарнікаў і буржуазіі гарантуюць устойлівасьць уземаадносін і ў самай Індыі, хоць-бы на некаторы тэрмін? Пры тым становішчы, што ва ўмовах жыцьця рабочае клясы і працоўных сялян нават не намецілася якога-небудзь палепшаньня, а, наадварот справа ідзе да ўсё большага і большага пагаршэньня, нельга разьлічваць на ўстойлівасьць у Індыі. Малейшыя спробы да абароны сваіх інтарэсаў у Інда-Кітаі буржуазная французская прэса абвяшчае «бальшавіцкімі козьнямі». Але падобнымі панічнымі лямантамі аб «пагрозе бальшавізму» нельга стварыць трывалага становішча для абароны капіталу, а можна толькі ўзмацніць папулярнасьць бальшавіцкіх ідэй у калёніяльных масах. У Кітаі правадыры генэральскіх зграй супрацоўнічаюць разам з прадстаўнікамі буйнейшых імэрыялістычных дзяржаў, але і тут ужо на працягу раду год пануючыя клясы паказалі сваю бясспомачнасьць у стварэньні ўмоў, неабходных для эканамічнага ўздыму і для палепшаньня становішча мас.

2. Адносіны капіталістычных краін да СССР і падрыхтоўка інтэрвэнцыі

У адносінах капіталістычных краін да СССР на кожным кроку ўсе больш сказваецца адбыўшаяся зьмена ў суадносінах паміж СССР і яго капіталістычным абкружэньнем.

Клясавыя ворагі чакалі правалу пяцігодкі. Але не дачакаліся гэтага. Пралічыліся. Цяпер, да часу цяперашняга зьезду, адбыўся ўжо значны пералом у настроях пануючых клясаў капіталістычных дзяржаў. З іх асяродку цяпер усе часьцей чутны панічныя галасы у сувязі з нашай пяцігодкай. Некаторыя буржуазныя органы ўсе часьцей даходзяць да ўзмоцненай папулярызацыі думкі, што «пяцігодка—лепшы сродак для зьнішчэньня капіталістычных краін» Прароцтвы наконт правалу пяцігодкі аказаліся пустымі. Пакуль паны буржуазныя палітыкі займаліся гэтымі прароцтвамі, яны ўлезьлі ў такі крызіс, якога яшчэ да гэтуль ня бывала. Цяперашні крызіс перавышае па сваёй сіле нават глыбачэзны эканамічны крызіс, які наступіў непасрэдна пасьля сканчэньня сусьветнай імпэрыялістычнай вайны І вось аказалася, што толькі адзін Савецкі Саюз знаходзіцца па-за сусьветным крызісам, што толькі адзін Савецкі Саюз ня толькі ўхіляўся гэтага крызісу, але пераможна ажыцьцяўляе тыганцкую праграму ўздыму народнае гаспадаркі. Пасьля гэтага ранейшыя разьлікі на буржуазнае перараджэньне СССР павінны былі, зразумелая рэч, затрашчаць па ўсіх швох.

Калісьці пры пераходзе Савецкага Саюзу да нэпу, выдатнейшыя прадстаўнікі міжнароднай буржуазіі, і ў іх ліку Лёйд Джордж, упэўнівалі: «У Расіі адбываецца цяпер пераход ад дзікага, нятуэнуладнага камунізму, існаваўшага год або два назад, або нават усяго некалькі месяцаў назад, да больш мяккай формы. Цяпер там прызнаюць, што калі ўзяць за выходны пункт чалавечую прыроду, як яна ёсьць, дык камуністычны лад немагчымы». Пераход да нэпу Лёйд Джорж і мнотыя другія зразумелі як «поўны паварот да капіталізму». Гэтыя паны буржуа паказалі ўсю абмежаванасьць свайго грамадзкага гарызонту, усю няздольнасьць самадавольнага буржуа ўявіць сабе, што небудзь іншае, апроч капіталістычнага рэжыму. Яны выходзілі са стаўкі на няўхільнае

ЖЫВЕЛАГАДОУЛЮ—У ЦЭНТР УВАГІ!

Ня менш як 2.225.000 галоў буйнай рагатай жывёлы павінен быць статак да канца 1931 году

Для забесьпячэньня жывёлы кармамі правесьці павярхнёвае палепшаньне сенажацяй на плошчы 300.000 га, засіласаваць 1 мільён тон зялёнай масы засеяць кармовымі травамі 470.000 га, кораньплодамі—80.000 га

Разьвіваць сацыялістычныя фабрыкі малака і мяса

У гэтым годзе мы прыступілі да практычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне будаўніцтва мясных фабрык. Мы ўжо зараз маем у паасобных саўгасах і калгасах прыкладныя сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы па вырашэньню мясной праблемы. Арганізацыя буйных жывёлагадоўчых гаспадарак пастаўлена ў цэнтр увагі ўсёй савецкай грамадзкасьці. XVI зьезд УсеКП(б) і XII зьезд КП(б)Б завострылі асаблівую увагу ўсёй партыі на мясной праблеме, далі чоткую дырэктыву форсіраванага будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых гаспадарак. Гэтае будаўніцтва павінна ісьці ўдарнымі тэмпамі.

Высунутая ўрадам праграма жывёлагадоўлі на аснове паказьненьняў XVI партзьезду, зьяўляецца адной з баявых праграм надыходзячай другой большавіцкай вясны.

Вось чаму, Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б палічыў неабходным яшчэ раз завастрыць увагу на гэтым пытаньні.

«У сувязі з тым, што разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў БССР зьяўляецца адной з важнейшых задач у разьвіцьці сельскай гаспадаркі, пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што вызначаныя ўрадам пляны разьвіцьця жывёлагадоўлі павінны быць усімі адпаведнымі арганізацыямі выкананы на ўсе 100 процантаў» (з рэзалюцыі пленуму).

Ажыцьцяўленьне гэтых загад патрабуе ад нас максымальна энэргічнай штодзённай практычнай работы.

Баявое заданьне ўраду—давесьці да канца 1931 году статак буйнай рагатай жывёлы да 2.225.000 галоў і да 1-га чэрвеня г. г. давесьці сьвінны статак да 2.925.000 галоў—павінна быць выканана.

Камплектаваньне жывёлагадоўчых фэрм набывае асаблівае значэньне. Нажаль, на сёньняшні дзень камплектаваньне статку выконваецца павольна.

Нездавальняючыя тэмпы камплектаваньня тлумачацца ня чым іншым як нядбайнасьцю загатоўчых арганізацый. Белжалгасцэнтр, а таксама і калгасы невыстарчальна зварачваюць увагу на гэтае важнейшае пытаньне.

Да тэтага часу раённыя выканаўчыя камітэты недастаткова цікавіліся ходам камплектаваньня спэцыялізаваных гаспадарак. У сваёй пастанове ад 3-XII-30 г. СНК БССР абавязаў раённыя выканаўчыя камітэты ўстанавіць сыстэматычны кантроль і праверку работы па ўкамплектаваньні, выслухоўваючы пэрыядычныя даклады аб ходзе камплектаваньня. Трэба праверыць як выконваецца на мясцох гэта дырэктыва ўраду. Белжалгасцэнтр, побач з выкарыстаньнем усіх магчымасьцяй камплектаваньня за кошт загатоўленай жывёлы, павінен скарыстоўваць поўнасьцю ўнутраныя магчымасьці.

Адным з тормазаў камплектаваньня ў значнай меры зьяўляецца невыкананьне плянаў будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. У справе будаўніцтва скотных двароў на мясцох не скарыстоўваюцца належным чынам унутраныя рэсурсы і магчымасьці.

Эканомія кармоў і загатоўка іх—адна з галоўнейшых задач сёньняшняга дню. Трэба жорстка змагацца супроць нерацыянальнага скарыстоўваньня кармоў у саўгасах і калгасах. Кожны калгас павінен устанавіць норму выдаткаваньня кармоў, выходзячы з сваіх унутраных рэсурсаў. У тых калгасах, дзе мяцціцца лішкі кармоў, неабходна перакінуць іх па дагаворанасьці, у калгасы, якія маюць у кармох вялікую патрэбу.

Апрацоўка малака.

Трэба максымальна скарыстаць адходы харчовай прамысловасьці (брагу, бульбяную мязгу і інш.), а таксама адкіды гаўняў і дрэнь для адкорму сьвіней.

Кармовая праблема зьяўляецца адной з асноўных зьвеньняў жывёлагадоўлі. Гэтаму пытаньню трэба зьвярнуць належную ўвагу ўжо зараз у сувязі з надыходзячай вясеньняй пасеўнай кампаніяй; пляны веснавой сяўбы павінны поўнасьцю адпавядаць гэта адно з важнейшых зьвеньняў бальшавіцкай вясны. Распоўпоўваючы пляны веснавой сяўбы, кожная жывёлагадоўчая гаспадарка павінна ў першую чаргу абгачарыць кагальне пашырэньня плошчы засеву кармовых культур. Трэба па баяному разгортваць загатоўку насеньня кармовых культур, траў і кораньплодаў. Да вясны трэба рыхтавацца па ўдарнаму. Трэба ўцягнуць у гэту справу ўсю рабочую масу саўгасаў і калгасьнікаў.

Беларусь зьяўляецца раёнам сьвінажывёлагадоўлі Саюзу. Стварэньне высокакваліфікаваных спэцыялізаваных сьвінавадоўчых гаспадарак зьяўляецца адной з асноўных задач, якія пастаўлены перад партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі. Гэтыя задачы павінны быць выкананы.

Трацяцца сотні тон мяса

Надаючы выключнае значэньне разьвіцьцю сацыялістычнай жывёлагадоўлі ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 20-XII 1930 г., аб мерапрыемствах па вырашэньні мясной праблемы намеціў рад канкрэтных шляхоў у галіне арганізацыі спэцыяльных сацыялістычных мясных фабрык.

Жывёлазагатоўкі, якія праходзяць зараз, павінны ў асноўным вырашыць пытаньне забесьпячэньня мясам пралетарскія цэнтры і дапамагчы хутчэй укамплектаваць статак нашага сацыялістычнага сэктару, а тымчасам пляны жывёлазагатовак Белмяса давяло да раёнаў са спазьненьнем да 1 з пал. месяцы; у некаторых сельсаветах пляны былі атрыманы толькі ў студзені. Апарат Белмяса зусім ня ведае, як да ведзены пляны да кулацка-заможнага двара і як яны выконваюцца.

Пры давядзеньні плянаў, з боку Белмяса ня даны дакладныя ўказаньні па пытаньні якасьці жывёлы, якая па вінна загатаўляцца, у выніку чаго зараз загатаўляецца пераважна маладняк—цяляты, парасяты, цельныя і прадукцыйныя каровы, якіх ня ў якім разе нельга забіваць. Раёны банбандыруюць Белмяса запытаньнямі, што рабіць з такой жывёлай. Адзнак. з Белмяса ні якага адказу не атрымліваюць.

Камплектаваньне статку сацэктару, дзякуючы праваапартуністычнай недацэнцы гэтай справы з боку Наркамзему, Белкалгасцэнтру, Белсельтрэсту, Белкаапсаюзу і інш. арганізацый, не праводзіцца. Пералічаныя ўстановы на агул ня ведаюць, што робіцца ў гэтым напрамку на мясцох.

Абмен непрадукцыйнай жывёлы ў саўгасах, калгасах і прыгародных малочных фэрмах не праводзіцца. Часта работнікі прыглядаюцца толькі да масьці кароў. Прыкладам агіднага адбору можа служыць заатэхнік саўгасу Самуэлева Ручнік, які адмовіўся браць кароў толькі таму, што яны белыя, а для племгасу, бачце, патрэбна жывёла чырвонай масьці хоць і непрадукцыйная.

Галавацяпскае плянаваньне перавозак і перагонак жывёлы з боку Белмяса даводзіць да таго, што жывёлу з Капаткевічаў гоняць у Петрыкаў, з Петрыкава ў Мазыр і зноў у Капаткевічы для адкорму.

А вось і вынікі «работы» Белмяса: жывёла на жывёлапрагонных базах стаіць па 8-10 дзён бяз корму і вады, пад адкрытым небам і, як правіла, на забой пасылаецца толькі тая жывёла, якая ўжо ня можа трымацца на нагах. Ад гэтага на адным Менскім мясакамбінаце за студзень м-ц т. г. страты мяса дасягаюць да 70 проц. агульнай колькасьці спажываньня мяса рабочымі гораду Менску (адпускаецца для гораду 97 тон, а трацінца ад галаданьня жывёлы 60 тон). Калі гэтую лічбу страт мяса аднесьці да ўсіх мясазагатовак па БССР, дык страты ад галаданьня жывёлы на базах будуць раўняцца гадавой патрэбнасьці мяса ўсёй БССР. Гэта толькі на пратонных базах Белмяса. А што робіцца на раёнах і ў базах?

Такая работа Белмяса ў выкананьні дырэктыў партыі і ўраду аб забесьпячэньні рабочых мясам і аб пасьніховым разьвіцьці жывёлагадоўлі ў сацыялістычным сэктары зрывае ўсякія магчымасьці вырашэньня мясной праблемы.

Бабак.

Баявую праграму ўраду—у масы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ РАЗЬВІЦЬЦЯ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ Ў 1931 Г.

Выходзячы з задач сацыялістычнай рэканструкцыі жывёлагадоўлі і падвышэньня прадукцыйнасьці жывёлы, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Давесьці:

а) да канца 1931 г. стада буйнай рагатай жывёлы да 2.225.000 штук, з іх: у саўгасах—93.250 штук, у калгасах (разам з неаграмаджанаю)—1.063.500 штук і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках—1.068.250 штук;

б) да чэрвеня 1931 г. стада сьвіней—да 2.925.000 штук, з іх: у саўгасах—156.000 штук, у калгасах (разам з неаграмаджанымі)—1.020.000 штук і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках—1.761.200 штук;

в) да канца 1931 г. стада коняй—да 1.015.000 штук, з іх: у саўгасах—13.000 штук, у калгасах—476.950 штук і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках—525.050 штук.

Заданьне па буйнай рагатай жывёле паміж паасобнымі сельска-гаспадарчымі трэстамі разьмяркаваць наступным чынам: Белсельтрэсту—38.500 штук. Насеннаводаб'яднаньню—6.290 штук, Малочнамаслатрэсту—12.250 штук, Трэсту «Сьвінавод»—16.200 штук, Галоўленкому—1.370 штук, Белкаапсаюзу—15.000 штук і іншым саўгасам—3.290 штук.

2. Устанавіць на 1931 г. заданьне для гадаваньня цялят у 700.000 штук, з іх: Белсельтрэсту—10.000 штук, Насеннаводаб'яднаньню—2.000 штук, Малочна маслатрэсту—2.000 штук, Трэсту «Сьвінавод»—3.500 штук, Галоўленкому—500 штук, Белкаапсаюзу—2.500 штук і іншым саўгасам—1.500 штук, а ўсяго для саўгасаў—22.000 штук, калгасаў—330.000 штук (аграмаджаных 180.000 штук і неаграмаджаных—150.000 штук) і для аднаасобных гаспадарак—348.000 штук.

Заданьне для гадаваньня цялят давесьці да саўгасаў, калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самаабавязнасьцяй, а да кулацка-заможных гаспадарак—у парадку цьвёрдых заданьняў.

3. Давесьці ў 1931 г. лік спэцыялізаваных малочна-жывёлагадоўчых фэрм у саўгасах Белсельтрэсту да 12 з колькасьцю кароў 9.000 штук, па Белкаапсаюзу—да 22 фэрм з колькасьцю кароў 12.600 штук, у калгасах—да 445 з колькасьцю кароў 78.000 штук, у малочных таварыствах—да 64 фэрм з колькасьцю кароў 3.200 штук, пры чым, да 1 чэрвеня 1931 г. гэтыя фэрмы павінны быць укамплектаваны на 65 проц.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Народнаму Камісарыяту Земляробства пры ўкамплектаваньні фэрм жывёлаю зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць жывёлы.

Вызначыць адзачу таварнай прадукцыі малака ад спэцыялізаваных малочных фэрм у наступным разьмеры: ад фэрм Белсельтрэсту—7.500 тон спажывецкай каапэрацыі—15.000 тон, кал гасаў—46.000 тон, Белмаджывёлсаюзу—1.125 тон, а ўсяго—69.725 тон.

4. Давесьці ў 1931 г лік сьвінаматак у саўгасах Трэсту «Сьвінавод» да 75.000 штук, у прамысловых сьвінагадоўчых калгасах—да 150.000 штук і атрамаджаных сьвінаматак у несьвінагадоўчых калгасах—да 22.500 штук.

Вызначыць адзачу таварнай прадукцыі сьвінагадоўчымі саўгасамі, калгасамі і паселішчнымі таварыствамі ў наступнай колькасьці: Трэстам «Сьвінавод»—60.000 штук, сьвінагадоўчымі калгасамі—180.000 штук, паселішчнымі таварыствамі—10.000 штук, а ўсяго—250.000 штук.

5. Для палепшаньня кіраваньня спэцыялізаванымі малочна-жывёлагадоўчымі і прамысловымі сьвінагадоўчымі таварнымі фэрмамі калгасаў арганізаваць у сыстэме Белкагасцэнтру аддзяленьні «Малакоцэнтру» і «Сьвінаводцэнтру» і даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белкалгасцэнтру не пазьней як праз дэкаду аформіць арганізацыю гэтых аддзяленьняў.

6. Давесьці матачны оклад Дзяржконзаводу да 350 штук і дзяржстаўні вытворнікаў—да 150 штук, ужыўшы захады да арганізацыі элевераў для гадаваньня маладняка на 400 штук, з іх: у саўгасах 50 штук, у калгасах 350 штук. Палепшаны склад кабыл да весьці да 1.000 штук, з іх: у саўгасах 200 штук, у калгасах—690 штук і ў першапачатковых жывёлагадоўчых таварыствах—200 штук.

7. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і Народны Камісарыят Земляробства давесьці лік бугаёў на злучных пунктах: у саўгасах—да 1.450 штук, у калгасах—да 17.300 штук, у паселішчных таварыствах—да 7.250 штук; лік жарабцоў у саўгасах—да 230 штук, у калгасах—1.190 штук, у паселішчных таварыствах—497; лік кныроў у саўгасах—да 1.500 штук, у калгасах—6.200 штук, у вытворчых таварыствах—3.000 штук.

Камплектаваньне злучных пунктаў закончыць да 1 красавіка 1931 г.

8. Лічыць патрэбным асноўную работу па племянной справе буйнай рагатай жывёлы сканцэнтраваць у саўгасах Малочнамаслатрэсту, па сьвінях—у саўгасах трэсту «Сьвінавод», па конях—па лініі Дзяржконзаводу, па птушках—па лініі Белсельтрэсту і Белптушкатрадукту.

Забясьпечаньне племяннымі кнырамі і племяннымі бугаямі прамысловых сьвінагадоўчых і малочных калгасаў усклаць на трэст «Сьвінавод» і Малочнамаслатрэст.

9. Для забясьпечаньня жывёлы кармамі правесьці павярхнёвае палепшаньне сенажацяў на плошчы 300.000 га, засеяць кармавымі кораньплодамі 80.000 га і кармавымі травамі 470.000 га, засілісаваць 1 мільён тон, разьмеркаваўшы заданьне па сіласу наступным чынам: Белсельтрэст—60.000 тон, трэст «Сьвінавод»—60.000 тон. Насеннаводаб'яднаньне—5.000 тон, Галоўленком—2.000 тон, Белкаапсаюз—50.000 тон, Малочнамаслатрэст—10.000 тон, Белмяса—5.000 тон, іншыя саўгасы—15.000 тон, калгасы—502.000 тон і аднаасобныя гаспадаркі—291.000 тон.

10. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белкалгасцэнтру падрыхтаваць 210 тэхнікаў па буйнай рагатай жывёле, 3.800 жывёлаводаў, 2.665 220 тэхнікаў па сьвінагадоўлі, 2.665 старшых сьвінароў і 130 птушкаводаў.

11. Вызначыць наступную будаўнічую праграму для будаўніцтва ў спэцыялізаваных жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах:

а) па буйнай рагатай жывёле ў саўгасах Белсельтрэсту—6.600 жывёла месц, у калгасах пабудаваць новых 30.000 жывёламесц і прыстасаваць 30.000 жывёламесц, па Белкаапсаюзу—7.500 жывёламесц і па Белмалжывёлсаюзу—3.200 жывёламесц;

б) па сьвіных у саўгасах—да 60.000 матачнікаў і да 70.000 адкормачнікаў, у калгасах—125.000 матачнікаў і 195.000 адкормачнікаў, у першапачатковых таварыствах—10.000 матачнікаў і 10.000 адкормачнікаў.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства не пазьней 15 сакавіка г г. забясьпечыць спэцыялізаваныя саўгасы і калгасы тыпавымі праектамі.

12. Прызнаць будаўніцтва ў жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых саўгасах і калгасах першачарговым і абавязаць ВСНГ забясьпечыць гэтае будаўніцтва будаўнічымі матарыяламі, а Народны Камісарыят Працы—саўгасы—патрэбнаю кваліфікаванаю рабочаю сілаю.

13. Абавязаць ВСНГ і Белсампрамсаюз выканаць праграму забясьпечаньня спэцыялізаваных жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў адпаведнымі машынамі для прыпитаваньня кармоў, а таксама кармазапарнікамі.

14. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства і Дзяржплян да 18 сакавіка 1931 г. фасцыраваць папярэдні кармовы баланс, выходзячы з лічбаў, паказаных у гэтай пастанове, і прыстасоўваючы да заданьняў, вызначаных у галіне шаляводзтва пастановаю СНК БССР за 3 сьнежня 1930 г. «Пра вясновую сельскагаспадарчую кампанію 1931 г.» (З. З. БССР 1930 г., аддзел II, № 38, паст 311).

15. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства і раённыя выканаўчыя камітэты ўжыць усе захады да выкананьня вызначаных мерапрыемстваў для разьвіцьця жывёлагадоўлі ў 1931 г., мабілізаваўшы вакол разьвіцьця жывёлагадоўлі шырокія колы савецкай грамадзкасьці і разгарнуўшы работу па разьвіцьці сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва і г. д.

Даручыць НК РСІ мець сталы нагляд за выкананьнем гэтай пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

3 сакавіка 1931 г.
г Менск.

Ня выконваюць загад ураду

У Астрашыцка-Гарадзецкім сельсавеце ня выконваецца пастанова СНК БССР аб забароне забою жывёлы. Сельсавет глядзіць па пастанову скрозь пальцы і ня прыцягвае да адказнасьці асоб, якія рэжуць цялят. Моцны сярэдняк Мецік Антось, ён-жа і член саюзу рабземлесу, прадаў сваю жывёлу на забой прыватніку. Гэты выпадак дае прыклад для іншых зьнішчаць жывёлу.

Сельсавет павінен прыцягнуць да адказнасьці ўсіх вінаватых у зьнішчэньні жывёлы. Саюз рабземлес з свайго боку павінен рэагаваць на такія выпадкі ўчынкі членаў свайго саюзу, бо гэта ня першы выпадак з боку Меціка.

Вока.

За мэтысызацыю статку

Надыходзіць вясна, у часе якой сыстэма жывёлагадоўчай каапэрацыі павінна шырока разгарнуць работу па арганізацыі пры першапачатковых вытворчых таварыствах сеткі злучных пунктаў з пастаноўкай ў іх ня менш 3000 кныроў, 500 быкоў, і 25 жарабцоў - вытворнікаў. Трэба зараззжа пачаць укамплектоўваць вытворнікамі сетку злучных пунктаў, каб да пачатку злучной кампаніі мець поўную магчымасьць запладніць усіх жывёламатак.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б даў дырэктыву правесьці на працягу 2-х год мэтысызацыю статку для панялічэньня таварнасьці сьвінога статку. На падставе гэтай дырэктывы неабходна зараз-жа прыступіць да забясьпячэньня злучных пунктаў і калгасаў вытворнікамі палепшанай пароды з такім разьлікам, каб увесь статак цалкам быў абслужаны вытворнікамі.

На сёньняшні дзень мы маем яшчэ масавы ацёл і апарос у веснавы пэрыяд. Для таго, каб не затрымліваць росту жывёлагадоўлі, які ў сучасны момант зьяўляецца адной з неабходнейшых прадпасылак разьвіцьця жывёлагадоўлі і каб хутчэй вырашыць праблемы харчаваньня нашай краіны прадуктамі жывёлагадоўлі, неабходна падрыхтаваць для злучной кампаніі патрэбную колькасьць вытворнікаў. У далейшым неабходна перабудаваць работу так, каб злучкі праводзіць на працягу ўсяго году.

На злучных пункты трэба падабраць лепшых вытворнікаў, якія маглі-б пад высіць прадукцыйнасьць жывёлы. На падбор вытворнікаў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага праз агляд іх заатэхнічным і вэтэрынарным пэрсаналам. Трэба памятаць, што ад якасьці вытворніка залежыць палепшаньне жывёлы і падвышэньне яе прадукцыйнасьці.

У першую чаргу неабходна скарыстаць лішніх вытворнікаў з саўгасаў, навукова-дасьледчых станцый і г. д.

Разьлічваць на завоз вытворнікаў з-за межаў БССР ня прыходзіцца, мы павінны скарыстаць усе нашы унутраныя магчымасьці. Магчымасьці да гэтага ёсьць: у нас маецца племянная і мэтысазаваная жывёла, якая ўжо даўно акліматызавалася ў нашых умовах і дае добрыя вынікі.

Трэба разгарнуць мабілізацыю сродкаў насельніцтва, каб набыць вытворнікаў і памяшканьне для іх. Мэтавыя ўзносы трэба сабраць у першую чаргу сярод каапэраванага насельніцтва. Уся вясковая грамадзкасьць павінна адгукнуцца і дапамагчы ў гэтай рабоце.

Сыстэма жывёлагадоўчай каапэрацыі павінна правярыць наяўнасьць на існуючых злучных пунктах вытворнікаў і іх якасьць для работы. Ёсьць вы падкі, калі першапачатковыя таварыствы ліквідавалі злучныя пункты; іх неабходна аднавіць, паставіць там вытворнікаў, каб і гэтыя пункты разгарнулі работу па веснавой злучцы жывёлы.

Арганізацыя злучной сеткі зьяўляецца адным з асноўных мерапрыемстваў жывёлагадоўчай каапэрацыі.

Журомскі.



Пабудова аборы.

Гальлё—на корм

У выніку недароду траў у мінулым годзе зараз адчуваецца недахоп грубых кармоў, асабліва сена. Цэлы рад гаспадарак сацыялістычнага сэктару ўжо апынуліся перад фактам недахопу кармоў. У некаторых саўгасах і калгасах становішча з кармамі пагрознае. З прычыны бязкормідзь пачынае чэзнуць жывёла, нават бываюць выпадкі, калі жывёла гіне.

Для таго, каб захаваць да вясны ў цэласьці ўвесь статак, трэба ўжыць самыя рашучыя захады, каб адшукаць новыя рэсурсы кармоў. У БССР мяцца неабмяжаваныя магчымасьці па здабываньні добрага корму для жывёлы. Такім кормам зьяўляецца гальлё лісьцянага лесу. Вопыт паказаў, што гальлё лісьцянага лесу, асабліва маладыя атожылкі, зьяўляюцца добрым кормам, які жывёла добра ясьць. Ён па сваёй спажыўнасьці не саступае сену сярэдняй якасьці, і ня ніжэй спа жыўнасьці яравой саломы.

Праведзеныя нагляданьні паказалі, што каровы вельмі добра ядуць дроб на парэзанае гальлё. Пастаўленыя на сечку з гальля каровы ня худзеюць, маюць добры выгляд і даюць добрыя ўдоі малака. Гэты корм не адбіваецца дрэнна на здароўі жывёлы. Захварэньня страўніка ня бывае. Нават коняй можна паставіць на сечку з гальля, дадаўшы да яе некаторую колькасьць аўсу (на 8 кілёграм корму—1 кілёграм аўсу). Сечка з гальля ў поўнай меры замяняе коням ёмісты фураж.

Ужываньне корму з гальля не зьяўляецца новым. У нашых умовах гэта мера ўжывалася ў выпадку вострага дэфіцыту грубых кармоў. У сёлетнюю весну, а таксама і зараз ужываньне гальля лісьцянага лесу на корм можа і павінна вывесьці нас з таго тупіка, у якім зараз апынуліся некаторыя нашы гаспадаркі, ў выніку бязкормідзь. Трэба зараз шырока арганізаваць загатоўку сечкі з гальля. Дзеля гэтай мэты неабходна выкарыстаць усе сячкарні і сіласарэзкі. У мясцох лесазагатовак зараз маецца шмат гальля, якое трэба выкарыстаць на корм. Тыя гаспадаркі, якія маюць трактары, павінны зараз-жа накіраваць іх у лес для арганізацыі мэханізаванай рэзкі сечкі.

Нашы саўгасы і калгасы павінны зараз-жа шырока арганізаваць загатоўку корму з гальля лісьцянага лесу. Да гэтай справы трэба прыцягнуць нашы грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу камсамол. Вакол гэтага пытаньня трэба мабілізаваць шырокую думку нашай грамадзкасьці.

Прыходзіцца канстатаваць, што ні Наркамзем БССР, ні Белкалгасцэнтр, ні саўгаскія цэнтры не зьвярнулі сваячасова ўвагі на арганізацыю загатоўкі сечкі з гальля лісьцянага лесу, не праявіўшы ніякай ініцыятывы ў гэтым пытаньні. Між тым наш цэнтральны друк («Известия», «Социалистическое Земледелие») даўно ўжо сыгналізавалі аб гэтым мерапрыемстве, але нашыя цэнтральныя арганізацыі палец аб палец ня ўдарылі, каб папулярызаваць гэту справу. Мажліва толькі зараз, атрымаўшы дырэктыву НКЗ СССР, беларускія арганізацыі возьмуцца за гэтую справу.

Трэба хоць цяпер належна паставіць загатоўку кармовай масы з гальля. Правядзеньне гэтага мерапрыемства—контроль. Усе гаспадаркі, ў якіх не ства трэба паставіць пад грамадзкі хапае грубых кармоў, павінны зараз-жа арганізаваць рэзку сечкі з гальля.

Слова за Наркамземам!

К. І.

Карова чырвонай беларускай пароды—гадавы ўдой—2882 літры.

ФІНПЛЯН ПАД УДАРАМ!

Праявы правага і „левага" апартунізму ў радзе раёнаў БССР ставяць пад пагрозу зрыву выкананьне фінпляну першага кварталу

„Рэалізаваць адозву X Ўсебеларускага Зьезду Саветаў БССР... мабілізаваць усю грамадзкасьць для таго, каб сакавік быў сапраўды ўдарным і рашаючым па выкананьні фінпляну першага кварталу" (*з пастановы СНК БССР*)

Бязьлітасна ўдарыць па праявах правага і „левага" апартунізму на практыцы

Пасьпяховае выкананьне гаспадарчых плянаў другога году дало нам магчымасьць значна павялічыць наметкі гаспадарчых плянаў на 1931 г. Тому ажыцьцяўленьне вялізарнай праграмы народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў работы на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта тым больш датычыцца выкананьня фінансавага пляну, які зьяўляецца рашаючай прадпасылкай для пасьпяховага ажыцьцяўленьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну.

Выходзячы з гэтага, аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) адзначыў, што **«бяз суровага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўлень не намечанага гаспадарчага пляну ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі»...** Але ня гледзячы на неаднаразовыя катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду, да гэтага часу патрэбнага пералому ў ходзе выкананьня фінансавага пляну яшчэ няма.

Даныя аб ходзе выкананьня фінансавага пляну за студзень і люты месяцы першага кварталу паказваюць па раду важнейшых раёнаў БССР рэзкае адставаньне ад плянавых заданьняў. Гэта якрава сьведчыць аб тым, што ў некаторых мясцох яшчэ не забясьпечаны патрэбны паварот увагі в боку партыйных, савецкіх, каапэрацыйных і прафэсыянальных арганізацый да фінансавай работы. Гэта сьведчыць таксама і аб тым, што ў некаторых фінансавых апаратах працягвае панаваць стаўка на апартуністычны самацёк, што ставіць пад пагрозу выкананьне фінансавага пляну ўсяго першага кварталу.

Выканана толькі 44 проц. фінпляну

Лічбы аб выкананьні фінансавага пляну па БССР за студзень і люты месяцы прымушаюць нас узьняць вялікую трывогу.

Фінансавы плян за гэтыя два месяцы на 1 сакавіка па ўсёй БССР выкананы толькі на 44 проц. квартальнага заданьня.

У чым-жа справа? Што перашкаджае пасьпяховаму выкананьню фінпляну? Справа ў тым, што некаторыя раённыя арганізацыі не апынуліся на палітычнай вышыні, яны недаацанілі гаспадарча-палітычнай важнасьці выкананьня фінансавага пляну, апынуліся ў апартуністычным балоце і ўвесь час плаваюць на хвалях самацёку.

Аднаразовы збор пад пагрозай

Плян аднаразовага збору на культурна-гаспадарчыя патрэбы на 1 сакавіка выкананы па вёсцы на **76 проц.** заданьня, а ў горадзе толькі на **28,4 пр.** Так, Прапойскі раён выканаў заданьне па культзбору на **36,7 проц.**, Уваравіцкі **39,5 проц.**, Гарадоцкі **41,7 проц.**, Чырвона-Слабодзкі і Менскі па **44,2 проц.**, Мсьціслаўскі **44,6 проц.**, Чэрвеньскі **46,1 проц.**, Чавускі **46,3 проц.**, Лагойскі **47,7 проц.** і Халопеніцкі **49,4 проц.**

Па пяці раёнах зусім няма ніякіх зьвестак аб паступленьні аднаразовага збору. Гэта гаворыць аб тым, што ў гэтых раёнах нічога ня зроблена (Бягомльскі, Віцебскі, Жлобінскі, Ляднянскі і Расьонскі раёны).

Што-ж да спагнаньня культзбору з кулацкіх гаспадарак, дык тут паўная небясьпека. Вось тыя раёны, якія замест **100-процантнага** спагнаньня ў абавязковым парадку аднаразовага збору з кулакоў, на 1 сакавіка спагналі толькі: Клічаўскі раён **1,4 проц.**, Азарыцкі **2,3 проц.**, Прапойскі **2,9 пр.**, Хоцімскі **3 проц.**, Касьцюковіцкі і Бешанковіцкі па **4,5 проц.**, Чэрвеньскі і Чавускі па **5,5 проц.**, Лагойскі **6,2 проц.**, Юравіцкі **7,7 проц.**, Магілеўскі **7,9 пр.**, Лёзьнянскі **8,1 проц.** і Асьвейскі **9,2 проц.**

Гэта яўнае прымірэнцтва да кулака, правы апартунізм на практыцы.

Гэта ў той час, калі была дана цьвёрдая катэгарычная дырэктыва партыі і ўраду аб 100-процантным спагнаньні на 1 сакавіка аднаразовага збору. СНК БССР прапанаваў **«...Раённым выканаўчым камітэтам і пракуратуры рэспублікі ў дэкады тэрмін ўжыць рашучыя захады для спагнаньня з кулацка-заможных гаспадарак... запазычаньці, прыцягваючы злосных неплацельшчыкаў да судовай адказнасьці...»**

Што-ж зроблена ў напрамку выкананьня гэтай пастановы СНК БССР з боку пракуратуры і райвыканкомаў? Нічога.

Яскравыя праявы правага апартунізму

Мы ня вельмі даўно падавалі матар'ялы аб тым, што ў Капыльшчыне не знайшлі кулака, а знайшлі яго толькі ў часе ўдарнага месяца. Сёньня мы прымушаны зноў, з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што гэткае зьявішча маецца і ў іншых раёнах БССР. Напрыклад, у Аршанскім раёне выяўлена 61 кулацкая гаспадарка, на якія налічана 29.877 руб. сельгаспадатку і з якіх на сёньняшні дзень спагнана толькі **8,3 проц.** У Шклоўскім раёне маецца 26 кулацкіх гаспадарак з налічэньнем на іх 10.215 руб., а спагнана толькі **13,5 проц.**, у Гарадоцкім раёне 14 кулацкіх гаспадарак з сумай налічэньня 15.194 руб., а спагнана **10,2 проц.**, у Краснапольскім 54 кулацкіх гаспадаркі з сумай налічэньня 17.432 р., спагнана-ж **18,1 проц.**, у Кохануўскім раёне знойдзена 35 кулацкіх гаспадарак з налічэньнем 13.399 руб., з якіх спагнана толькі **15 проц.**, у Расьонскім раёне 17 кулацкіх гаспадарак з сумай налічэньня 12.337 руб., а спагнана **18,7 проц.**, у Менскім раёне знайдзена 107 кулацкіх гаспадарак з налічэньнем сумы ў 51.039 руб., спагнана ўсяго **12 проц.**, у Буда-Кашалёўскім раёне 106 кулацкіх гаспадарак на суму 66.067 руб., спагнана **21,5 проц.**, у Барысаўскім 107 кулацкіх гаспадарк з налічэньнем сумы 22.044 руб., спагнана-ж **20,8 проц.**, у Асьвейскім 37 кулацкіх гаспадарак з якіх належыць сельгаспадатку 13.056 руб., спагнана-ж **27,3 проц.**, у Карманскім раёне 96 кулацкіх гаспадарак на суму 30.564 руб., спагнана ўсяго **25,3 проц.** і інш. Карацей кажучы, з **1.624.443 руб.**, належных плацяжоў з кулацкіх гаспадарак, па ўсёй БССР на сёньняшні дзень спагнана толькі **908.171 руб.**, што складае **55,9 проц.** выкананьня, у тым ліку і вынятых маёмасьцяй.

Бываюць такія выпадкі, калі кулак прыходзіць у райвыканком, альбо сельсавет, абяцае плаціць грошы, яму даюцца адтэрміноўкі, потым кулак ня плаціць і на яго забываюцца.

Бываюць і такія выпадкі, калі пры апісаньні маёмасьці кулацкіх гаспадарак, апісваюцца такія дробныя рэчы, як куфар, які каштуе ўсяго 10 руб., а тое, што маецца ў куфры—як 250 мэтраў мануфактуры, дываны, абрусы і нават гарэлка, такія рэчы зусім не апісваюцца (Слуцк).

Гэткія адносіны знаходзяцца ў поўнай супярэчнасьці з правядзеньнем генэральнай лініі партыі і яны льлюць ваду на млын клясавага ворага і зьяўляюцца яскравым праяўленьнем правага апартунізму на практыцы.

Яшчэ на XVI зьезьдзе УсеКП(б) тав. Сталін гаварыў: **«Зьверская барацьба кулацтва супроць калектыўных форм гаспадаркі ў вёсцы... сабатаж з боку бюракратычных элемэнтаў апарату... галоўныя формы супраціўленьня адмываючых клясаў у нашай краіне».** І далей тав. Сталін падкрэсьлівае **«...каб прыдушыць супраціўленьне клясавых ворагаў.., для гэтага існуе толькі адзін сродак: арганізаваць наступленьне на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце і ізаляваць апартуністычныя элемэнты ў нашых уласных радох...»**

„Левацкія" загібы

Мы сустракаем ня толькі прымірэнцкія адносіны да капіталістычных элемэнтаў з боку некаторых нашых раённых арганізацый, але поруч з гэтым мы маем праявы і «левага» ўхілу ў адносіне да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Так, у Касьцюковіцкім раёне бяз усякіх падстаў і адзнак было індывідуальна абкладзена 14

Законы і пастановы ўраду БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНЫ І ДАПАЎНЕНЬНІ ПАЛАЖЭНЬНЯ ПРА НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ЮСТЫЦЫІ БССР

У зьвязку з ліквідацыяй Народнага Камісарыяту Ўнутраных Спраў і зямельных камісій (З.З. БССР, 1931 г., № арт.) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зрабіць наступныя зьмены і дапаўненьні Палажэньня пра Народны Камісарыят Юстыцыі БССР (З.З. БССР, 1929 г., № 21, паст. 121):

1. У п. «в» арт. 1 выключыць словы: «Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю па зямельных справах» і «зямельных і».

2. Пункт «г» арт. 1 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«г) агульнае кіраваньне папраўча-працоўнай палітыкай».

3. Арт. 4 дапоўніць пунктам «г» у наступнай рэдакцыі:

«г) інспэкцыя месц зьвяволеньня».

4. Дапоўніць Палажэньне пра Народны Камісарыят Юстыцыі БССР артыкулам 10 у наступнай рэдакцыі:

«10. Праз інспэкцыю месц зьвяволеньня Народны Камісарыят Юстыцыі ажыцьцяўляе:

а) агульнае кіраваньне папраўча-працоўнай палітыкай і правядзеньне ў жыцьцё папраўча-працоўнага заканадаўства;

б) арганізацыю і кіраваньне месцамі зьвяволеньня, ссылкай з прымусовымі работамі і прымусовымі работамі бяз трыманьня пад вартай;

в) арганізацыю дапамогі вызваленым з месц зьвяволеньня і

г) кіраваньне вывучэньнем злачынасьці і мэтадаў змаганьня з ёй.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

6 сакавіка, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ АРТ. 4 ПАСТАНОВЫ ПРА ПАМОЛЬНЫ ЗБОР

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Запісаць арт. 4 пастановы СНК БССР за 14 жніўня 1929 г. «Пра памольны збор» (З.З. БССР 1929 г., № 35, паст. 203) у наступнай рэдакцыі:

«4. Памольны збор бярэцца збожжам альбо семем і толькі тою культураю, якая перапрацоўваецца і з разьліку тае колькасьці збожжа альбо семя, якая прывезена на мальнае прадпрыемства для пераапрацоўкі».

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня не пазьней як праз дэкаду даць паказаньне мясцом аб ажыцьцяўленьні гэтай пастановы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

13 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА СКАРАЧЭНЬНЕ Ў 1931 г. АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫХ ВЫДАТКАЎ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ГАСПАДАРЧЫМ РАЗРАХУНКУ, КРЭДЫТНЫХ УСТАНОЎ І КААПЭРАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

У адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР за 11 лютага 1931 г. «Пра скарачэньне ў 1931 г. адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў дзяржаўных органаў, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, крэдытных устаноў і каапэрацыйных арганізацый», Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Скараціць у 1931 г. на 7 проц. адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі дзяржаўных органаў, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, крэдытных устаноў і каапэрацыйных арганізацый рэспубліканскага і мясцовага значэньня ў параўнаньні з сумаю вызначаных выдаткаў на каштарысу.

Гэтае скарачэньне не пашыраецца на адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі прадпрыемстваў, занятых беспасрэдна вытворчаю дзейнасьцю (фабрыкі, заводы і саўгасы), а таксама на выдаткі пачатковых каапэрацыйных арганізацый, апроч кіраўніцтваў раённых спажывецкіх таварыстваў.

2. Абавязаць ведамствы і ўстановы, пералічаныя ў арт. 1 гэтай пастановы, разьмеркаваць сумы, на якія павінны быць скарочаны адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі, паміж паасобнымі аб'яднаньнямі і арганізацыямі і разьмеркаваньне гэтых сум падаць у Народны Камісарыят Фінансаў не пазьней 5 сакавіка 1931 г.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў па тых аб'яднаньнях і арганізацыях, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, утрымаць сумы паводле разьмеркаваньня, паказанага ў арт. 2 гэтай пастановы, з асыгнаваньняў на фінансаваньне народнай гаспадаркі.

4. Абавязаць арганізацыі, якія не фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту, уносіць належачыя з іх сумы ў тэрміны, устаноўленыя Народным Камісарыятам Фінансаў, аб чым Народны Камісарыят Фінансаў павінен выдаць адпаведную інструкцыю.

5. Даручыць НК РСІ устанавіць сыстэматычны нагляд за выкананьнем гэтай пастановы і сапраўдным скарачэньнем гаспадарчымі органамі адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў у 1931 г.

6. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам зрабіць адпаведнае скарачэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў у падпарадкаваных ім гаспадарчых арганізацыях.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

3 сакавіка, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ДАПАЎНЕНЬНЕ КРЫМІНАЛЬНАГА КОДЭКСУ БССР АРТЫКУЛАМІ 102¹ і 141¹.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** дапоўніць Крымінальны Кодэкс БССР артыкуламі 102¹ і 141¹ у наступнай рэдакцыі:

«102¹. Адмаўленьне ці ўхіленьне інжынэрна-тэхнічных работнікаў ад пераходу на іншую работу па сваёй спэцыяльнасьці па загадах органаў працы, выклікае—

штраф да чвэрцісот руб., альбо прымусовыя работы да аднаго году».

«141¹. Парушэньне кіраўнікамі органаў працы і кіраўнікамі прадпрыемстваў, устаноў і гаспадарак законаў аб найме і плянавым разьмеркаваньні рабочай сілы, выклікае—

штраф да трохсот рублёў, альбо прымусовыя работы да шасьці месяцаў».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

6 сакавіка, 1931 г.
г. Менск.

ПАПРАЎКА

У пастанове ЦВК і СНК БССР ад 15-II-31 году «пра зьмены законадаўства БССР у сувязі з пастановаю ЦВК і СНК СССР» пра падатак з будынкаў і зямельную рэнту» («Савецкая Беларусь» № 51 за 2-III-31 г.):

1) У арт. 8 замест слоў «з захаваньнем арт. арт. 8-11 гэтых правіл» трэба—«з захаваньнем арт. арт. 9-15 гэтых правіл».

2) У арт. 13 замест слоў «больш 2/5»—«ня больш 2/5».

3) У арт. 14 замест слоў «паверкі плянаў»—«паверхні пляцоў».

У пастанове СНК пра разьвіцьцё ашчадсправы, зьмешчанай у «Сав. Бел», № 57, па вінє карэтуры ўкраліся памылкі: у п. 3, абзац 3, замест «касавых»—трэба чытаць «масавых», у п. 7—замест «грамадзкіх»—трэба чытаць «гарадзкіх» апроч гэтага, у п. 8—замест «15 проц. сумы», трэба чытаць «15 проц. агульнай сумы».

Кожны працоўны—удзельнік лётарэі

Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяцу

Краіна пралетарскай дыктатуры паставіла перад сабою задачу ў 3-м рашаючым годзе 5-ці годкі зьвяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Капіталістыя вядуць падрыхтоўку, да нападу на наш Савецкі Саюз. Пад кіраўніцтвам каму ністычнае партыі мы павінны ўсімі мерамі, сіламі і сродкамі ўзмацняць абароназдольнасьць нашае краіны, умацоўваць баявую магутнасьць Чырвонае армії.

На Т-ва Чырвонага Крыжу ускладзены надзвычайна вялікія і адказныя задачы па падрыхтоўцы працоўных да вайскова-санітарнай абароны краіны праз арганізацыю гурткоў і пунктаў першае дапамогі, санітарных дружын, курсаў санітараў, дэзынфэктараў, школ і курсаў мядычных сясьцёр, а таксама і пашырэньне санітарна-асьветнай культуры сярод мас працоўных, перабудова працы і быту на сацыялістычны лад.

З мэтай узмацненьня фінансавай базы Т-ва на ажыцьцяўленьне і правядзеньне гэтых задач па дазволу ураду СССР у гэтым годзе Выканкомам Саюзу Т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырв. Паўмесяцу СССР праводзіцца 1-я Ўсесаюзная лётарэя на суму ў 10 млн. руб. Кошт аднаго білету ўстаноўлены ў 50 к.

Па характару прадметы выйграшаў дзеляцца на наступныя катэгорыі і на наступныя сумы: 1) Кватэрны пай на суму 40.000 руб.; 2) Стацыянарныя месцы—на курорты і дамы адпачынку на 99.000 р.; 3) Паездкі па СССР на 22.000 руб.; 4) Тавары дэфіцытныя і востра-дэфіцытныя на 1 млн. 50 тыс. руб.; 5) Кнігі і літаратура на 15.000 р.; 6) Аблігацыі Дзяржпазык на 175.000 р. У сярэднім адзін выйгрыш прыпадае на 173 білета. Лётарэйныя білеты падзяляюцца на 8 разрадаў, якія будуць разыграны 6 тыражамі у наступных месцах: Ленінград 15-IX—г. г., Менск 1-X—г. г., Сьвердлоўск 15-X, Растоў 1-XI, Масква 15-XI, Харкаў 1-XII, Ташкент 30-XII, Баку 30-XII—1931 г.

Для БССР выдзелены 1 млн. білетаў на суму 500.000 руб., якія прапарцыянальна разьмеркаваны паміж гарадзкімі і раённымі к-тамі Т-ва Чырвонага Крыжу для распаўсюджваньня іх сярод працоўных БССР.

Прэзыдыум ЦК Т-ва Чырвонага Крыжу БССР выраша́ў 20 проц. ад рэалізаванай сумы перадаць гарадзкім і раённым к-там, 45 проц. цэнтралізаваць у рэспубліканскім маштабе на вайскова-санітарную работу і 5 проц. на агульную чырвона-крыжную работу.

Раённым і гарадзкім к-там і ячэйкам Чырвонага Крыжу даны цьвёрдыя заданьні, па распаўсюджваньні лётарэйных білетаў. Усе савецкія, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны актыўна дапамагчы Т-ву Чырвонага Крыжу ў распаўсюджваньні і рэалізацыі лётарэйных білетаў.

Не павінна быць ніводнага працоўнага БССР бяз білета 1-й Ўсесаюзнай чырвона-крыжнай лётарэі.

Ганьба ілжэўдарнікам!

У газэце «Савецкая Беларусь» (№ 49, ад 28-II-31 г.) была зьмешчана заметка аб тым, што аграномы і спэцыялісты сельскай гаспадаркі г. Менску абвясьцілі сябе ўдарнымі і прымацаваліся на ўвесь 1931 г. да абслугоўваньня прыгарадных гаспадарак г. Менску.

Шмат аграномаў і спэцыялістаў праводзяць у жыцьцё свае абяцаньне. Лепшымі ўдарнікамі аказаліся аграномы-выкладчыкі Курасоўскага с-г тэхнікуму, аграномы і навуковыя працаўнікі садова-гароднай станцыі. Але поруч з прыкладнай работай некаторых аграномаў многія спэцыялісты сельскай гаспадаркі толькі на паперы лічацца ўдарнікамі.

Аграномы і навуковыя работнікі Менскай расьлінаводнай станцыі **Прохараў, Жванскі, Савіцкі, Тачынскі, Рудакоўскі, Швэркевіч, Радзівонаў, Ганчароў, Хаміч, Сакс, Сворскі, Стаўнік, Парафіновіч ды інш. і ня зьбіраюцца наведаць прымацаваныя гаспадаркі.** З Балотнага Інстытуту таксама ня выехалі т.т. Дакукін, Шыперка, Янушкевіч. З Сьвінагадоўчага Інстытуту не паехалі Сьмірноў, Драздоў, Ваярэвіч, Пікус, Шавена, Воўнадаў. З Інстытуту рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ня выяжджаюць т.т. Бюзюк, Гітарман і інш. З апарату Белкагасцэнтру ня прымаюць удзелу ў гэтай работе т. т. Арэстовіч, Карнейчык, Антанікоўскі.

Ёсьць шмат аграномаў і ў іншых установах, якія толькі «зьбіраюцца» дапамагчы прыгарадным калгасам і саўгасам у прывядзеньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Такія адносіны паасобных спэцыялістаў да дапамогі калгасам і саўгасам у рабоце ёсьць ні што іншае, як яўны зрыў падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны і рабочага забесьпячэньня. Ня гледзячы на ўсе захады, якія прымаў гарсавет, яны ня выяжджаюць на месцы. Сорам тым таварышом, якія ўнікаюць ад удзелу ў падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

А. Фандарэнка.

Суд і быт

Пакараць зрыўшчыкаў усеагульнага навучаньня

Згодна пастановы нарады Белкаапсаюз павінен быў забесьпечыць абуткам і вопраткай вучняў беднаты і батрацтва 500 тысяч чалавек. Белсампрамсаюз зрабіць 500 тысяч пар абутку, выпрацоўваючы штомесяц ня менш як 12 тысяч пар і Саюзскуры зрабіць 60 тысяч пар абутку. Для выкананьня гэтых заданьняў нарада даручыла сачыць Белсампрамсаюзу.

На падставе гэтых дырэктыў Белсампрамсаюз у адказнай асобе тав. Бязручкі павінен быў зараз-жа атрымаць ад Наркамасьветы ведамасьці аб ліку вучняў батрацтва і беднаты ў процантных суадносінах па гадох, а таксама разнарадку для адгрузкі па раёнах абутку і вопраткі. Але на вялікі жаль Бязручка не сьпяшаўся ня гледзячы на тое, што ўжо надыйшлі халады. Ён за гэтую работу ўзяўся толькі 18 лістапада 1930 г. У выніку гэтага шкодніцтва і частковай бязьдзейнасьці школы засталіся бяз вопраткі і абутку і вялікая колькасьць вучняў кінула наведваць школу.

Большасьць выпушчаных тавараў толькі падыходзіла на 2-4-6 гадовы ўзрост у той час, як патрабавалася ў большасьці на 8-10-15 гадовы ўзрост. Так Віцебскае спажывецкае т-ва атрымала 365 шт. паліто на 4-5 гадовы ўзрост, Чашніцкае спажывецкае т-ва атрымала 225 шт. і ўсе на 2-4 гадовы ўзрост.

З боку Белшвэй'абяднаньня на чале з т. Бэрлінам было дапушчана шкодніцтва ў ацэнцы тавараў. Замест таго, каб налажыць цану на кожны разьмер паасобку, т. Бэрлін накладваў цану на ўсе разьмеры як на 2-х, так і на 14-ці гадовы ўзрост аднолькава. Цана, накладзеная на тавары, не адпавядала прэйскурантным цэнам.

Справа шкоднікаў будзе разглядацца Вярхоўным судом 13 сакавіка 1931 году.

Абвінавачваюцца ў зрыве ўсеагульнага навучаньня т. Бэрлін Ш. А., па 69 арт. Крым. Кодэксу, Шапіра, М. Л., Ашармовіч В., Пашкевіч Г. В., Бязручка М. і Панкевіч К. К., па 196 арт. К. К.

Боська М. Я.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

У в. Чабатовічы, Уваравіцкага раёну, у час лесазагатовак сын кулака Фаміён Цімох набіў старшыню жывёлагадоўчага т-ва т. Кухарэнка Міколу, за тое, што Кухарэнка выступаў супроць кулацтва. Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці кулака Фаміна Цімоха.

Селькор Сролікаў.

У в. Усохі, Быхаўскага раёну жыве кулак Лапухоў Хама, які мае моцную гаспадарку і кузьню; індывідуальным падаткам ён не абкладзены, таму, што ў яго дома п'янствуюць старшыня сельсавету Белакузаў і старшыня сельскага КТСУ Клінцоў.

Неабходна пазбавіць сельсавет і КСТУ ад Белакузава і Клінцова, а кулака Лапунова абкласьці індывідуальным падаткам.

Абідны.

Чабатавіцкая ячэйка КП(б)Б Уваравіцкага раёну, а таксама і ячэйка ЛКСМБ зусім ня цікавяцца работаю рабселькораў і ня кіруюць рабселькораўскім рухам.

Селькор.

У Халопеніцкім раёне ніякай работы з рабселькорамі не праводзіцца. Раённая нарада рабселькораў ужо 2 гады не скліканая. Насьценгазэты пры нардоме, хатах-чытальнях і сельсаветах ня выходзяць. Рабселькоры не мабілізаваны на барацьбу за правядзеньне 2-й калгаснай вясны. ЦП Саюзу паперова-паліграфічнай вытворчасьці Беларусі, якое шэфствуе над Халопеніцкім раёнам таксама нічога не зрабіла, каб разгарнуць работу сярод рабселькораў і наладзіць сталы выхад райгазэты. «За калектывізацыю».

Домінакоў Р.

У газэце «Савецкая Беларусь» у артыкуле «Савецкая Беларусь» дапамагала» пісалася аб тым, што факт агідна бюракратызму з боку загадчыка забесьпечаньня Глускага райспажыўтаварыства т. Бунім пацьвярдзіўся і што т. Бунім па пастанове РайРСІ будзе зьняты з работы. Прайшло больш трохмесяцаў з таго часу, а т. Бунім яшчэ ня зьняты з работы і астаецца таксама бяздушным бюракратам.

Глускай РСІ трэба быць пасьледавацельнай і больш настойлівай у выкананьні сваіх-жа пастаноў.

Тарас Кветка.

У газэце «Савецкая Беларусь» і пасьцендруку м. Капцэвічы ня раз былі сыгналы, што з-за адсутнасьці разгортваньня самакрытыкі на прадпрыемствах і рабкаопе м. Капцэвічы, Петрыкаўскага раёну маецца многа агідных зьяўішч. Нядаўна рэўкамісія рабкаопу выкрыла, што ў буфэце Капцэвіцкай сталоўкі маецца растрата на 2000 руб. Зьняты з работы загадчык буфэту. Мы лічым неабходным зьняць з работы старшыню трайўленьня рабкаопу і загадчыка сталоўкі, бо яны не рэагавалі на дотісы рабселькораў, чым садзейнічалі злачынству.

Рабочы.

Ухвальокае пашчотовае аддзяленьне Крупскага раёну несваячасова дастаўляе газэты падпішчыкам. Маюцца факты, што многа газэт прападае. Начальнік адзяленьня т. Шуцько гаворыць, што няма часу разнасіць. Між іншым на пошце лістаносцам служыць падкулачнік Швэд Яфрэм атрымлівае 40 руб., а лісты і газэты ня прыносіць кажа, што яму сорамна.

Шыло.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Шпакову — «Патрэбна перабудова» Накіравана Вушацкаму РВК; Сролікаву—«Газэты ў вёсцы няма»—Уваравіцкаму РВК; К. Хведарскаму — «Парыцкія бюракраты спрыяюць дрэнай дастаўцы газэт»—Парыцкаму РВК.

Селькору 324—«Аб прасьледваньні Лебедзева» накіравала Крупскаму райпракурору; І. Б.—«Зажым і ганеньне» —Полацкаму РВК; Свайму—«Работа ізвініце за выражэньне» — Петрыкаўскаму РВК; Грамабою—«Пахне шкодніцтвам»—Бярэзінскай РКК РСІ. Знайдзіку — «Галавацяпства Чашніцкага спажыўтаварыства» — Чашніцкай РКК РСІ; А. М-кі—«Кулацкія махінацыя»—Вульскай Рай КК РСІ; А. Геніну — «Шкодніці разьвалваюць калгас «Зара» — Капыльскаму РК КП(б)Б; Герману — «Трэба пракурорскае ўмяшацельства» — Заслаўскай РКК РСІ; Безушко — «Скарга» накірована на расьледваньне; Гінтоўту — «У Бягомлі міліцыя пазбаўлена выбарчых правоў» — Цэнтральнай выбарчай камісіі; Батурэвічу — «Каго Піцікі с.-с. абкладывае індывідуальна» — Капаткевіцкаму РВК. Сьвыду — «Аб калгасным руху» — Бярэзінскаму РВК; Буйвалу—«Аб атрыманьні пэнсіі» — Капаткевіцкаму РВК.

Жылку — «Рабселькораўскі рух. Случчыны на агледзе»накіравана Случкай райгазэце; Лявіцкаму — «Аб'ектыўныя прычыны зрываюць навучань не» — Сьмілавіцкаму Райінспэктару асьветы; Сролікову — «Ваўкі ў авечай кожы» — Уваравіцкай РКК РСІ. Наблюдаўшаму — «Аб выяўленьні кулакоў» — Капаткевіцкаму РВК; Воку — «Цэнтравік з партфэлям» накіравана на расьсьледваньне; Гаўбіцкаму — «Аб праве голасу» Тураўскаму РВК; Воку — «Не дапушчальнае зьявішча» — Веткаўскаму РВК; Жуку — «Убійцаў вон з савецкая ўстановы» — Кармянскаму РКК РСІ; Веніку — «За што толькі яны ядуць савецкі хлеб» — Кармянскаму райпракурору; Шульману — «Няма ні якай падрыхтоўкі» — Лельчыцкаму РВК; Зіновічу — «Галавацяпства, якое мяжуецца са шкодніцтвам»—Чэрвенскай Рай РСІ; С. С. Лукашэнку — «Дрыжаць перад начальствам» — Чэрвенскай Рай РСІ; Муцьвіцы — «Каган, Розу трэба сушакоіць».—Мазырскаму РВК; Авадню — «Час пачакаць» — Копыскаму інспэктару асьветы Т. Майфыну — «З перавыбарчага фронту» —Барковіцкаму РК КП(б)Б; Ударніку —«Ці не парушаны закон»—Чэрвенскай Рай РСІ; Курсанту — «Шкодная прана Калінаўскага» — ня пойдзе пішэце ў насьценгазэту.

Ведаючаму — «Аб пасеўкампаніі», М. Піскуну — «Бальшавіцкая ўборка пераканала» і «Праз галовы апартуністаў», А. Вясёламу — «Сельсавет сьпіць», Грыдзюшку — «Зяблевае ворыва стаіць пад пагрозай зрыву», У. Сяркову — «Пра зяб. успашку», Рубіну — «Калгас Камуніст абзавіў сябе ўдарнікам», вашы допісы друкавацца ня будуць.

ПАПРАЎКА

У № 56 (1545) газэты «Савецкая Беларусь» у артыкуле т. Яраслаўскага «Бальшавікі і меншавікі» ў трэцім калёнцы пасьля слоў «менавта гэты вопыт даў падставу Леніну аказаць аб іх у 1918 г. што»:

Трэба чытаць: «уся гісторыя 15-гадовай барацьбы бальшавікоў з меншавікамі ў Расіі (1903—1917 г.) даводзіць, як і даводзяць гэта і ўры расійскіх рэвалюцыі, што меншавікі бязумоўна наогул ня мелі працы і што яны на справе былі агентамі буржуазіі ў рабочым руху» (том 20, частка II).

У чацьвертай калёнцы надрукавана: ...«Не, шлях бальшавізму—гэта шлях пралетарскай рэвалюцыі ва ўсіх краінах, гэта шлях вызваленьня рабочае клясы, вызваленьня працоўных «ва ўсім сьвеце».

Павінна быць: ...«Не, шлях бальшавізму—гэта шлях пралетарскай рэвалюцыі ва ўсіх краінах, гэта шлях вызваленьня рабочае клясы, вызваленьня працоўных ва ўсім сьвеце.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

ПЭДГАБІНЭТ

12-III—у 20 гадзін сход настаўнікаў «0» груп. Практыка, антырэлігійная выхаваньня ў «0 групах».

13-III—у 20 гадзін сходы настаўнікаў 2-х, 3-х і 4-х груп. Распрацоўка праекту—«прыйсьце удзел у 2-й бальшавіцкай вясьне».

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе ўсіх жадаючых паступіць у Маскоўскі Камуністычны Інстытут Журналістыкі, што тэрмін падачы заяў у ЦК працягнуты да 20 сакавіка (жадаючыя павінны тэрмінова падаць праз Райкомы, ячэйкі адпаведныя дакументы).

Паведамляецца, што 14-III-31 г., а 7 гадзіне вечара ў Комнузе (Унівэрсытэцкая 27) адбудзецца паседжаньне Таварыства Гісторыкаў-Марксыстаў. На аб'вестцы дню—працяг спрэчак па дакладу т. Матулайціса, аб 1863 годзе.

Уваход вольны. Запрашаюцца асьвіранты і настаўнікі.

Праўленьне.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 9-га САКАВІКА

„Чырвоная Зорка“	НА ТЫМ БАКУ. Драма ў 7 част. Кіно-хроніка № 4. Штодзённа 3 сэансы: а 7 г. 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв.
Кіно-тэатр „Культура“	З эпохі грамадз. вайны. АПАЙКА. З ныш праграмы—За всеобуч. Пач. а 7 г. Каса а 5 гадз.
Кіно інтэрнацыянал	Савецкі фільм. ГАМБУРГ. Драма ў 8 част. з пралёгам. Пачатак 1 сэансу а 6 гадз. Каса адчынена з 4 гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	ПАДКОВА ШЧАСЬЦЯ. Камэдыя ў 6 частк. Монці Бэнкс Штодзённа 4 сэансы. Пачатак а 6 гадз. Каса з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	Цікавы фільм 1) ДЖЭНТЭЛЬМЭН і ПЕВЕНЬ. Орыгін. льн. камэд. у 6 ч. 2) БУНТ ЗУБОЎ. Культур-фільм у 2 ч. Пачатак а 1 гадз. дню. Каса адчынена ад 12 г. дню.

Камісія ЦКК-РСІ паведамляе,

ШТО ПРАЦЯГ СХОДУ СТУДЭНТАЎ

супольна з рабочымі па грамадзкаму агляду дзейнасьці катэдры зоолёгіі Беларускай Акадэміі Навук АДБУДЗЕЦЦА

13 САКАВІКА, А 7 ГАДЗІНЕ ЎВЕЧ.

у прыродазнаўчым корпусе (Унівэрсытэцкі гарадок, 3 паверх, аўдыторыя № 1). На сход запрашаюцца навуковыя працаўнікі БАН, БДУ, выкладчыкі тэхнікумаў, настаўнікі.

Камісія ЦКК-РСІ.

ЗАВОДУ „БЕЛАРУСЬ“ ПАТРАБУЕЦЦА

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР

з вытворчым стажам; умова па згодзе (магчыма прадастаўленьне пакою)

Зварочвацца: завод „Беларусь“,

заводакіраўніцтва, Старажоўская, 44, тэл. 616.

Для здачы абвестак званеце па тэл. 2-44

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ АБ ЗГУБЕ ДАКУМАНТАЎ 1 р.

Пры Віцебскім Індустрыяльна-Пэдагагічным Інстытуце з 1 красавіка 1931 г. адчыняецца

Вячэрні Індустрыяльна-Пэдагагічны Інстытут

З 2-ма АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ

1. ФІЗЫКА-ТЭХНІЧНАЕ—Беларуская група. Яўрэйская група.
2. ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНАЕ—Беларуская група.

Мэтавая ўстаноўка тая-ж, што і дзённага.

УМОВЫ ПРЫЁМУ:

1. У лік студэнтаў прымаюцца асобы не маладзей 17 год.
2. Асобы, якія жадаюць паступіць, падаюць заяву з абавязковым паказаньнем факультэту і аддзяленьня, на якім яны жадаюць вучыцца. Да пазнёнай заявы далучаюцца наступныя дакументы:
а) дакумант аб узросьце (мэтрыка);
б) дакумант аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын);
в) дакумант аб асьвеце;
г) дзьве фатаграфічныя карткі;
д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя па тупаючага;
е) дакумант, які сьведчыць сацыяльны і матэрыяльны стан паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі;
ж) даведка, пасьведчаная пізавой савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў;
з) для сялян—акладны ліст альбо засьведчаная копія з яго па с.-г. падатку на 1929-30 г., а калі зваходзіцца ў калгасе, спраўку аб гэтым;
і) для саматужнікаў адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 год;
к) анкета, з вераная прафэсыянальнымі або саве цкімі організацыямі і ўстановамі.

Увага: 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца (за выключэньнем дакумантаў аб адносінах да вайсковай павіннасьці) У выпадку страты дакумантаў, павінен быць пададзены дублікат яго.

Ад іспытаў асл баняюцца: скончыўшыя рабфакі, тэхнікумы, 2-гадовыя агульна-адукацыйныя курсы, 9-гоку (1929-30 г.).

Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, 2-гадовыя пэдагагічныя курсы. ФЗВ і прафшколы на базе сямігодкі.

Прыём заяў працягнуты да 15 сакавіка. Іспыты з 20 па 25 сакавіка. Пачатак заняткаў—1 красавіка 1931 г.

Студэнты вячэрняга інстытуту інтэрнатам і стыпэндыяй не забясьпечваюцца.

Асобам, прыслаўшым дакументы ў дзённы інстытут на зімовы набор і не заліченых у інстытут з прычыны адсутнасьці месц, трэба падаць заяву аб жаданьні вучыцца ў вячэрнім інстытуце.

За дырэктара інстытуту МЭЙЗІНА.

На падставе загаду па Белдзяржбудаб'яднаньні ВСНГБ ад 25 лютага 1931 г. № 40,

Магілеўская акруговая будаўнічая кантора БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ ВСНГБ

(быўш. Белдзяржбуд) **ЛІКВІДУЕЦЦА**

і з 3 сакавіка г. г. спыніла сваю дзейнасьць.

Для ліквідацыі ўсіх спраў б. Магбудкіторы прызначана ліквідацыйная камісія, якая пачала сваю працу з 3 сакавіка г. г.

Усім зацікаўленым асобам і ўстановам належыць прад'яўляць свае прэтэнзіі да 15 сакавіка, пасьля якога тэрміну яны прымацца ня будуць.

ЛІКВІДКАМІСІЯ.

З 1-га красавіка г. г.

пры Рабочым Факультэце

БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ

АДЧЫНЯЮЦЦА ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ

па падрыхтоўцы на Рабфак

Слухачы, якія закончаць курсы, будуць бяз іспытаў залічаны на першы курс Рабфаку. Асобы, якія жадаюць паступіць на курсы, павінны падаць заявы на імя Прыймовай Камісіі курсаў.

Заявы прымаюцца штодзённа ў канцылярыі Рабфаку(Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус 3-ці паверх, пакой № 3—14 ад 10 гадзін з ранку да 7-мі гадзін увечары.

Да заявы неабходна дадаць усе дакументы, указаныя ў даведніку для жаючых паступіць у Рабфакі (аб узросьце, аб сац. паходжаньці, аб сацстановішчы, аб адносінах да вайсковай павіннасьці, анкета, заверaная ўстановай ня ніжэй раённага маштабу, камандыроўка і інш).

Правілы прыёму на курсы тыя самыя, што і ў Рабфакі. На курсы будзе залічана 120 асоб, з якіх 60 асоб на беларускае аддзяленьне.30 на яўрэйскае аддз., і 30 на польскае аддзяленьне. Стыпэндыяй студэнты курсаў забясьпечаны ня будуць.

Загадчык Рабфаку Б. Дз. У. Рамановіч

Капыская школа ФЗВ керамічнае вытворчасьці

АБВЯШЧАЕ

ЗІМОВЫ НАБОР ВУЧНЯЎ

НА 1-ы КУРС НА БАЗЕ СЯМІГОДКІ.

Заявы з адпаведнымі дакумантамі (згодна даведніка) прымаюцца да 20 сакавіка.

Адрас: п.-а. Копысь, школа ФЗВ.

Загадч. школы КУЗЬНЯЦОЎ.

ЗГУБЛЕНЫ:

Больнічны лісток Лалцэвіча І. Г., выд. Амбул. пры з. «Домбаль», кв. 1466-п.

Паявая кніжка Яраш эвіча В. Т., выд. Барысаўск. столом пайшчыкаў, кв. 1466-п.

Білет саюзу хэмікаў за 534083 Багдановіча З. С. выд. Н.-Бар. ф-кі «Красная Березина». 1466-п.

Даведка Балцэвіча І. Г. аб аслабаненьні, кв. 1466-п.

Мэтрычны выпіс нарадж. 1909 году, Паўлініча О. К., выд. Барысаўск. ЗАГС-ам, кв. 1466-п.

Пасьведчаньне Казлоўскага Е. Л., выд. Халопеніцкім РІК-ом, квіт. 1466-п.

Пашпарт Жукоўскага Н. І., выд. Барысаўскай міліцыяй, квіт. 1466-п.

Членскі білет № 1886 Жукоўскага Н. І., выд. саюзам Дрэваапрацоўнікаў з. «Камунар», квіт. 1466-п.

Членскі білет саюзу Хімікаў Н. Барысава, ф-ка «Чыр. Берэзіна» на імя Хозімовай Г. І., квіт. 1466-п.

Пасьведчаньне аб скончэньні Барысаўскай школы 9-ці годкі № 33 на імя Казлоўскай М. І., квіт. 1466-п.

Членскі білет № 3673 Дабравольскага П. выд. Саюзам мэталістаў гор. Севастопаль, квіт. 1466-п.

Ваяковая кніжка Дабравольскага П. выд. Севастопальскім ваенкаматам, квіт. 1466-п.

Паявая кніжка Яраш эвіча В. Т., выд. Барысаўскім стал. пайшчыкаў, кв. 1466-п.

Членскі білет № 534083 Багдановіча З. С., выд. саюзам Хімікаў, ф-ка Чыр. Берэзіна», квіт. 1466-п.

Спраўка аб вызваленьні Балцэвіч, Комізырынскі край, квіт. 1466-п.

Бальнічны лісток Бялцэвіч І. Г., выд. амбул. пры з-дзе «Домбаль», кв. 1466-п.

Мэтрычны выпіс нарадж. 1909 г. Паўлініча О. К., выд. Барысаўскім ЗАГС-ам квіт. 1466-п